№ 9 (319) 7 сакавіка 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Подых навальніцы




Вынікі мясцовых выбараў.

старонкі 2–4

### Джордж Буш

Прынцыпы і забабоны прэзыдэнта ўсяго сьвету.

старонка 14

### Скрыпка Ўкраінскі

Інтэрвію франтмэна «Вопляў Відаплясава».

старонка 13

### Я пісаў языкамі лавы

Новыя вершы Славаміра Адамовіча.

старонка 15

# Мой ідэал — Кастусь Каліноўскі

**Дэпутацкая група «Рэспубліка» пасьля трох гадоў ваганьняў перайшла ў адкрытую апазыцыю Лукашэнку. Яе прадстаўнікі далучыліся да аргкамітэту «Народнага маршу» 12 сакавіка. Яна заклікала галасаваць на мясцовых выбарах супраць прадстаўнікоў намэнклятуры. 27 лютага яна арганізавала ў Доме ўраду круглы стол, прысьвечаны 85-годзьдзю БНР, упершыню з 1996 г. правёўшы ў будынак прадстаўнікоў апазыцыі. Унікаючы радыкалізму, «рэспубліканцы» пайшлі на кантакт зь незалежным грамадзтвам. На восеньскую сэсію яны мяркуюць вынесьці папраўкі ў законы аб выбарах, СМІ і мове. Гэта тры ключавыя акты, на грунце якіх магчымы пераход да дэмакратыі ў Беларусі.**
**З часу прэзыдэнцкіх выбараў не адчувалася большага ажыўленьня ў палітычным жыцьці краіны. «Рэспубліка» вылучыла і свайго лідэра. Ім стаў Уладзімер Парфяновіч. Ён усяго некалькі гадоў у палітыцы. У дэпутаты прыйшоў як алімпійскі чэмпіён і бізнэсовец, які, паводле ягоных словаў, «заўсёды выйграваў у супернікаў столькі, колькі хацеў». На ток-шоў «Выбар» ён паабяцаў праз год загаварыць па-беларуску. Ён прэзэнтуе сябе як новы пазытыўны палітык з рэальным поглядам на рэчы. Уладзімер Парфяновіч адказвае на пытаньні карэспандэнта «НН».**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Працяг на старонцы 5.

# Марш 12 сакавіка

Арганізатары «Народнага маршу» 12 сакавіка разьлічваюць сабраць самае маштабнае вулічнае шэсьце апазыцыі ад 2000 г. У аргкамітэт акцыі ўвайшлі нават дэпутаты палаты прадстаўнікоў.

Асноўным арганізатарам шэсьця, якое атрымала назву «Народны марш «За лепшае жыцьцё!», выступае «Хартыя-97». Лёзунгі маршу — «Зьменшыць квартплату і камуналку!», «Падвысіць заробкі, пэнсіі й стыпэндыі!», «Спыніць ціск на прадпрымальнікаў!» і г.д.




Акцыя мусіла адбыцца яшчэ 17 лістапада 2002 г. Праўда, пад іншай назвай — «Беларусь. Дэмакратыя. Дабрабыт». Але ў апошні момант арганізатары перанесьлі яе на 2003 г. Ім не ўдалося загітаваць да ўдзелу ў акцыі ўсе апазыцыйныя сілы. «Марш быў недастаткова падрыхтаваны», — так выказаўся ў сваёй заяве выканкам АГП. Тады з жорсткім адказам выступіў Зьміцер Бандарэнка: «Можна сказаць, што асноўныя апазыцыйныя партыі сёньня знаходзяцца ў глыбокім крызысе, дэманструюць поўную бездапаможнасьць».

Падрыхтоўка да Маршу 12 сакавіка вылучаецца магутнай рэклямнай кампаніяй з выкарыстаньнем сучасных прыёмаў. Штодзённа прыходзяць новыя паведамленьні аб падтрымцы Маршу з боку вядомых дзеячоў інтэлігенцыі, апазыцыі.

Працяг на старонцы 11.

**«Наша Ніва» запрашае**
да супрацоўніцтва рэклямныя агенцтвы і агентаў па рэкляме на выгадных умовах. Інфармацыю пра сябе дасылайце на электронны адрас nn@promedia.by.

Т./факс: 284-73-29.



# Подых навальніцы

**Каля 110 з 750 зарэгістраваных дэмакратычных кандыдатаў перамаглі ў першым туры мясцовых выбараў. Праўда, толькі 27 згадвалі ў бюлетэнях пра сваю партыйную прыналежнасьць. Яшчэ 70 дэмакратаў выйшлі ў другі тур. Вызначыліся камуністы-калякінцы: 123 з 290 вылучэнцаў ПКБ перамаглі ў першым туры і яшчэ пара дзясяткаў працягнуць барацьбу 16 сакавіка. Ніводнай перамогі ў ЛДПБ. Выбары прадэманстравалі, што лукашэнкаўская сыстэма пачынае людзей стамляць. Аднак і апазыцыйныя партыі непапулярныя. Нечуваная колькасьць выбарцаў выказалася супраць усіх кандыдатаў — як у акругах безальтэрнатыўных, так і там, дзе кандыдат ад апазыцыі супрацьстаяў «беспартыйнаму» прэтэндэнту ад партыі лукашэнкаўцаў. У краіне высьпявае пратэставы электарат, які пакуль ня мае сваіх нацыянальных лідэраў.**

## Юры Зянковіч



перамог на выбарах у раённы і сельскі саветы (Ждановічы—Кунцаўшчына—ст.Радашкавічы). Ён абышоў усе кватэры ў шматпавярховіках сваёй Ждановіцкай акругі, і там «супраць усіх» галасавалі 15% выбарцаў. На прыватны сэктар яго не хапіла, і пратэставы працэнт на гэтым участку дасягнуў паловы ўдзельнікаў галасаваньня.

## Алесь Зарамбюк



актывіст «Маладога фронту» і сацыял-дэмакратычнага руху з Мастоў, раскатаў свайго апанэнта-дарожніка ў блін: 74% супраць 15%. Каманда Зарамбюка пабыла ў кожным доме. «Калі ацэньваць на прыкладзе Мастоў, інвэстыцыі ў інфраструктуру трэцяга сэктару апраўдалі сябе. Сэмінары, тусоўкі, якія столькі крытыкавалі, далі плён. Уся мая каманда перабывала на трэнінгах. Мы правялі кампанію на заходні манер, і ў Мастох гэта спрацавала». На думку Зарамбюка, для перамогі шмат зрабілі лідэры мясцовае інтэлігенцыі Язэп Палубятка, Лявон Вашко — «парадаю і маральна». Іншыя мастоўскія кандыдаты-нацыяналісты выйгралі ў сваіх акругах, хоць і не дабралі да 50%.

«У мяне такое ўражаньне, што выйграў бы любы, каго не зьнялі з рэгістрацыі і хто не ленаваўся абысьці ўсіх выбарцаў», — кажа Вольга Карач у Віцебску. Яна атрымала 51% галасоў, але ня верыць гэтаму выніку. «З-пад носу ў маіх хлопцаў «зьбеглі» дзьве скрыні для галасаваньня, і менавіта ў іх за мяне нібыта прагаласавалі меней за 50%». Ёй ёсьць чым ганарыцца: у акрузе з 7069 выбарцаў яна сабрала ў сваю падтрымку 2000 подпісаў, а ў яе камандзе працавалі 43 актывісты.

Вольга набыла вядомасьць як каардынатарка «Зубра» на Віцебшчыне. «Зубр», як і КХП-БНФ Зянона Пазьняка, галасаваньне байкатаваў. А Вольга вырашыла «пайсьці на выбары, да якіх дэмакраты не былі гатовыя».

Увечары ў нядзелю яе людзі назіралі на ўсіх участках, пасьля 6 зуброўцаў сядзелі пад выканкамам, каб скрынкі зь бюлетэнямі нікуды не падзелі. А 5-й ранку нехта невядомы патэлефанаў ёй на мабільнік: «Вольга, здымай аблогу, ты выйграла». Яна расказвае мне ўсё гэта, седзячы... у РУУСе. Не, яе не арыштавалі. Яна з сваімі зуброўцамі прыйшла павіншаваць міліцыянтаў, знаёмых з часоў прэзыдэнцкае кампаніі, з прафэсійным сьвятам.



**Вольга Карач стала дэпутаткаю Віцебскага гарсавету**

Такіх, як Вольга, маладых ды імпэтных, па краіне аказаліся дзясяткі.

Васіль Главацкіх у Наваполацку таксама зрабіў стаўку на татальнае назіраньне і масавы кантакт з выбарцамі. «Нават уначы яны потайкі ў біноклі сачылі з дахаў за памяшканьнем выбарчага ўчастку!» — цмокае стары, савецкае загартоўкі, наваполацкі дысыдэнт Вінцэсь Мудроў. «Мне напярэдадні выбараў шмат хто раіў: прыхавай сваю прыналежнасьць да БНФ, — кіпіць ад імпэту Васіль. — А я вырашыў праверыць, ці прыстае да чыстага цела бруд, ці тая хлусьня, якую распаўсюджвае БТ, выклікае ў нармальных людзей нешта апроч агіды». Вынік: Главацкіх набраў 39% галасоў, удвая больш, чым ягоны галоўны канкурэнт з вэртыкалі, і разьлічвае на перамогу ў другім туры. Ягоная задача цяпер — ня даць уладзе арганізаваць у акрузе байкот.

«Улада яшчэ пашкадуе, што прапусьціла праз сіта рэгістрацыі апазыцыйна настроеную моладзь, адсеяўшы старых палітыкаў», — не бяз долі разгубленасьці прызнаецца адзін зь лідэраў сацыял-дэмакратаў.

### Партыі на выбарах

У кожнай палітычнай партыі, нават найменшай, ёсьць свая мікраскапічная падстава для гонару. Возьмем дэмакратаў. БНФ выйграў у першым туры ў найбольшай колькасьці акругаў (11). У АГП бесцырымонна зрэзалі найбольш небясьпечных для ўлады кандыдатаў. БСДП (НГ) правяла ў другі тур найбольшую колькасьць сяброў (22) — пераважна ў буйных гарадах. Незарэгістраваная АСДП цешыцца, што ў яе кандыдатаў найвышэйшы працэнт «праходнасьці». Але ж яны ішлі як беспартыйныя.

ЛДПБ вылучыла найбольш кандыдатаў. А Партыя камуністаў беларуская правяла ў саветы аж 125 сваіх дэпутатаў, больш за трацiну вылучаных. Калі б у партыі быў кандыдат у кожнай акрузе, мы б цяпер мелі камуністычныя саветы. Калі б у ПКБ было каго выставіць...

Апазыцыя выступіла нечакана добра. Толькі ў сталіцы «лукашэнкаўскі сьпіс» перамог ва ўсіх акругах.

«Мая сям'я на выбары не хадзіла, — кажа пісьменьніца Наталка Бабіна. — Калі б у нас ішоў Хадыка, быў бы сэнс галасаваць, але яго не зарэгістравалі. А што толку выбіраць між стрыжаным і голеным?»

### Фэнамэнальная анатомія сталіцы

І без таго нізкую мабілізацыю сталічнага дэмакратычнага электарату падсілкавала агітацыя КХП. «Ня йдзі! Усё адно падмануць!» — заклікалі масава распаўсюджаныя ўлёткі. І сапраўды, 52 з 52 абраных у Менску кандыдатаў — з «лукашэнкаўскага сьпісу». Адзіны прадстаўнік апазыцыі прабіўся ў другі тур у Трактаразаводзкай акрузе. Старанны падбор кандыдатаў, жорсткі адсеў апазыцыі і скандальныя 20% датэрміновага галасаваньня зрабілі сваю справу.

Але нават такая перамога лукашэнкаўцаў не пераконвае. У дэпутаты прайшлі ня Скобелеў і не Канаплёў. Усе гэтыя дырэктаркі школаў з мэнэджэрам «Лукойлу» Ўладзімерам Круком і паэтам-песеньнікам Аляксандрам Лягчылавым уключна аднойчы зробяцца вельмі самастойнымі дэпутатамі. Калі?.. Як толькі адчуюць новую сілу апазыцыі.

### Геаграфія апазыцыі

Кандыдаты ад апазыцыі перамагалі нават там, дзе раней незалежнае грамадзтва ня мела асяродкаў: у Сяньне, Круглым, Камянцы, Маларыце. Найбольш энэргічна дэмакратычны рух правёў выбары ў Барысаве\Жодзіне, Бярозе\Белаазерску, Мастах, Верхнядзьвінску, Воршы\Барані, Наваполацку, Пухавічах\Мар'інай Горцы, Бабруйску, Менскім раёне, Горадні. Тамсама, дзе кандыдаты ад апазыцыі актыўнічалі ў часе прэзыдэнцкіх выбараў. Практычна ўсе мінімальна прахадныя кандыдаты ад нацыянальна-дэмакратычнага руху, якія толькі былі зарэгістраваныя, перамагалі ў Вялейцы, Пружанах, Рагачове, Навалукомʼі. У Мсьціславе на ўвесь раён былі дзьве альтэрнатыўныя акругі, і ў абедзьвюх прайшлі дэмакраты. Прычым 27-гадовы настаўнік гісторыі Алесь Галакціёнаў — у першым туры. У Гарадку перамаглі тры кандыдаты з дапісчыкам «НН» Леанідам Гаравым на чале. Такое пратэставае галасаваньне можна вытлумачыць паскудным эканамічным станам прамысловасьці ў гэтых гарадах і гарадках. Але гэта не прымяншае высілку кандыдатаў-пераможцаў.

Працяг на старонцы 11.

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

## Чаму гэтыя выбары прайграла ўлада

Зьняцьце апазыцыйных кандыдатаў у працэсе выбараў выглядала бесцырымонна. Такое ўражаньне, што яно адбылося па выніках прагляду бюлетэняў, укінутых у скрыні для датэрміновага галасаваньня.

Пераход да дэмакратыі патрэбны ўсім. Не апазыцыянэрам, інтэлігентам, бізнэсоўцам, а ўсяму грамадзтву. Безь яе ня будзе доўгатэрміновай стабільнасьці. Можна спрачацца, ці быў пэрыяд аўтакратыі непазьбежны ў часе станаўленьня дзяржаўнасьці. Але безумоўна ня будзе стабілізацыі без дэмакратыі.

Улада змарнавала шанец нармалізаваць сытуацыю ў краіне. Пераход дэпутацкай групы «Рэспубліка» ў адкрытую апазыцыю — першы ўдар у адказ. За ім будуць іншыя. Аляксандар Лукашэнка здольны па прыкладзе мінулых гадоў пайсьці на абвастрэньне сытуацыі. Але гады ўжо ня тыя. Аднойчы абвастрэньне павернецца супраць абвастральніка.

Улада прайграла гэтыя выбары, на якіх ніхто нічым не рызыкаваў. Другога такога шанцу ў яе можа і ня быць.

**Андрэй Дынько**

## Безальтэрнатыўная кандыдатка ад апазыцыі



Адзіным раёнам Беларусі, дзе ўлады пакінулі дзьве акругі кандыдатам-дэмакратам, быў Верхнядзьвінск. Яны балятаваліся безальтэрнатыўна і перамаглі. У раёне на выбары выйшлі 10 дэмакратаў, ці, як іх традыцыйна называюць, «бээнэфаўцаў». Зь іх чацьвёра выйгралі. Асабліва заўважылі ў Падзьвіньні посьпех Паўла Івашчанкі, былога дырэктара лягсагу, які страціў пасаду з палітычных матываў.

**«Першая асоба раёну, Восіп Палачанін, з апазыцыяй носіцца. Сам разумее, што гэта трэба», — жартуе Валянціна Кудлацкая («Народная Грамада»), мясцовая лідэрка нацыянальнага руху.**

## Горад, дзе перамаглі дэмакраты

У Белаазерску дэмкааліцыя на чале зь Юр'ем Губарэвічам узяла 7 месцаў у гарсавеце з 12. Яшчэ ў 13 акругах дэпутаты пакуль ня вызначаныя. На вынік паўплывала эканамічная дэпрэсія. Абутковая фабрыка «Белкельмэ» тыдзень перад выбарамі не працавала дзеля сэзоннага спаду попыту на прадукцыю.



Людзі сьвядома галасавалі «супраць» намэнклятуры. Намесьнік старшыні гарсавету атрымаў толькі 46%, а былы старшыня — 35% галасоў, хоць былі яны ў сваіх акругах адны. Дэмакратычныя традыцыі ў Белаазерску заклала яшчэ на золку незалежнасьці суполка «Агмень», сапраўдным агмянём якой была паэтка Ніна Мацяш.

**Юрась Губарэвіч пайшоў у дэпутаты ня згопалу. Ён больш за год выдаваў у Белаазерску газэту «Альтанка» і дапоўніў сваю адукацыю інжынэра-электрыка навучаньнем у магістратуры Львоўскага ўнівэрсытэту па спэцыяльнасьці «Паліталёгія й дзяржаўнае кіраваньне». Вынік — 55% галасоў супраць 32% у кіраўніка ягонага штабу. «Мы не пазыцыянавалі сябе як апазыцыя і не чапалі палітыкі, — кажа ён. — Мы былі проста альтэрнатывай абрыдламу начальству».**

**Сьцяжкамі адпаведных партый пазначаныя раёны Беларусі, дзе перамаглі ці выйшлі ў другі тур дэмакратычныя партыйныя кандыдаты. Гэта пераважна паўночны захад Беларусі і Меншчына — рэгіёны, у якіх нацыянальны рух наймацнейшы, а нацыянальная сьведамасьць абудзілася найдаўней — яшчэ ў пачатку мінулага стагодзьдзя.**




КАЛАЖ АНДРЭЯ ЧЫКА

ЯКОЮ МОВАЮ АГІТАВАЛІ КАНДЫДАТЫ АД АПАЗЫЦЫІ?

# Пытаньне, прыдуманае элітай

Сябра Партыі БНФ Аляксей Янукевіч, які балятуецца ў дэпутаты Менгарсавету, 23 лютага распаўсюдзіў у сваёй акрузе беларускамоўныя ўлёткі-віншаваньні, на адваротным баку якіх намалявана, як завязваць гальштук. У Менску па-беларуску зьвярталіся да выбарцаў толькі прадстаўнікі БНФ. Іншыя дэмакратычныя кандыдаты (ад АГП, «Народнай Грамады») агітавалі па-расейску. Іншы раз гэта глядзелася ненатуральна — як у выпадку гісторыка Ніны Стужынскай, дасьледніцы Слуцкага збройнага чыну, ці Сяргея Чыслава, арганізатара патрыятычнага выхаваньня моладзі. Вынік аднолькавы: апазыцыйныя кандыдаты ў Менску сабралі ад 20 да 35% галасоў, незалежна ад мовы і партыйнасьці.

У **Магілёве** па-беларуску вялі агітацыю сябра БНФ Рыгор Костусеў, а таксама прадстаўнік Свабоднага прафсаюзу Аляксей Паўлоўскі. А вось сябра БНФ Зьміцер Салаўёў выпусьціў расейскамоўныя ўлёткі. У іх тэксьце кідаецца ў вочы слова «дабрабыт». Дзякуючы гэтаму акцэнту ці не, але ён выйшаў у другі тур.

Сярод дэмакратычных кандыдатаў **Віцебску** па-беларуску вялі агітацыю сябры БНФ Уладзіслаў Токараў, Кастусь Смолікаў і Віктар Шляхцін. Беспартыйныя Яраслаў Манцэвіч і Тацяна Севярынец (сястра лідэра «Маладога фронту») надрукавалі два варыянты ўлётак — па-беларуску і па-расейску. А кандыдат ад БНФ Хрыстафор Жаляпаў, які выйшаў у другі тур, вёў агітацыю выключна моваю «міжнацыянальных зносін».

У **Воршы** па-беларуску агітаваў за сябе толькі дырэктар школы №22, сябра незарэгістраванай АСДП Юры Нагорны.

У **Глыбокім** па-беларуску вядуць агітацыю рэдактар газэты «Вольнае Глыбокае» Ўладзімер Скрабатун, а таксама сябры БСДП (НГ) Зьміцер Курцэвіч і Юлія Бука. Сымптаматычна, што кіраўнік «Народнай Грамады» Мікола Статкевіч на пачатку кампаніі гаварыў, што партыйная стратэгія — агітаваць па-расейску, «каб быць бліжэйшымі да выбарцаў». Глыбачане, як бачым, маюць свае падыходы.

У **Берасьці** ўсе кандыдаты ад БНФ (Васіль Барболін, Ніна Давыдоўская, Яўген Бяласін, Уладзімер Красько, Сяржук Бахун) аднадушна друкуюць улёткі й гутараць з выбарцамі беларускай мовай. Апрача іх, па-беларуску там не агітаваў ніхто.

У **Гародні** сябра БНФ і кіраўнік Незалежнага прафсаюзу аб’яднаньня «Азот» Сяргей Антусевіч вядзе агітацыю па-расейску. Беларускай мовай з усіх кандыдатаў у дэпутаты карысталіся толькі ягоныя аднапартыйцы Валер Кісель і Вадзім Саранчукоў. Працэнтавыя вынікі С.Антусевіча і В.Кісяля прыкладна аднолькавыя — 33 і 35%. Праўда, С.Антусевіч выйшаў у другі тур, бо ў ягонай акрузе было больш за 2 кандыдаты, а выбары ў акрузе, дзе В.Кісель падзяліў сымпатыі зь міліцэйскім начальнікам, не адбыліся.

У **Слоніме** ў дэпутаты балятаваліся два прадстаўнікі БНФ — Алесь Масюк і Іван Шэга, якія агітавалі выбарцаў па-беларуску. Малады А.Масюк набраў 24% галасоў, а І.Шэга перамог ды стаў дэпутатам.

У **Маладэчне, Валожыне** і шэрагу іншых заходнебеларускіх гарадоў прадстаўнікі намэнклятуры выдавалі свае агітацыйныя матэрыялы па-беларуску. І выйгралі. У той жа час былі цэлыя раёны як на Захадзе, так і на Ўсходзе Беларусі, дзе беларускай мовай не карысталіся кандыдаты ні ад уладаў, ні ад апазыцыі. Так было ў **Мастох, Мсьціславе**.

Парадаксальна, што па-расейску часам агітавалі нават тыя, хто ў прыватным жыцьці беларускамоўны. Але галасоў гэта ім не давала. Выбарцы зьвярталі больш увагі на біяграфію, рэпутацыю і аблічча кандыдата.

**Мікола Бугай, Адам Воршыч**



**Алесь Міхалевіч (Мар’іна Горка, БНФ): «Для народу пытаньня, якою моваю да яго гаварыць, не існуе. Гэтае пытаньне прыдумала сабе эліта. Народу важна, хто гаворыць, што гаворыць і як гаворыць. А якою моваю — няважна». А.Міхалевіч сабраў 76% галасоў. Мовай ягонай агітацыі была беларуская.**

# Няўдачнікі выбараў

Дэпутат Вярхоўнага Савету XIII скліканьня **Валеры Шчукін** заняў у сваёй полацкай акрузе толькі 3-е месца.



Дэпутат Вярхоўнага Савету XIII скліканьня **Павал Знавец** ішоў на выбары ў Менску як беспрацоўны. Яму не ўдалося пераадолець 10-працэнтавае мяжы.

Былы прэтэндэнт на пасаду старшыні «Маладога фронту» ў Гародні **Вадзім Саранчукоў** меў супернікамі лідэра гарадзенскай суполкі АГП Юр’я Істоміна і доктара Ігара Макаранкава. Вадзіму таксама не ўдалося пераадолець 10-працэнтавага бар’еру.



Ніводная кандыдата не правяла ў саветы зь першага заходу **Лібэральна-дэмакратычная партыя**.

Самае ж гучнае паразы на гэтых выбарах зазнаў былы камдыў, намесьнік дырэктара Барысаўскага крышталевага заводу **В.Захарчанка.** Ён ішоў на выбары безальтэрнатыўна і быў пэўны, што пераможа. Ягонага суперніка Сяргея Салаша (кааліцыя «Дэмакратычны Барысаў») «зрэзала» камісія. Экс-камдыва супакойвала і тое, што адзін з двух участкаў акругі — вайсковая часьць. Але каманда Салаша распаўсюдзіла 2000 улётак з заклікам галасаваць супраць. Яны выбралі такую тактыку, бо байкот палічылі немагчымым: начальства магло арганізаваць галасаваньне ў прымусовым парадку. У выніку, паводле папярэдніх зьвестак, на «цывільным» участку супраць камдыва прагаласавалі 70% выбарцаў, на «вайсковым» — 59%. А Салаш зьбіраецца выставіць сваю кандыдатуру на паўторнае галасаваньне.

**Мікола Бугай**



IREX-PROMEDIA

**Сяргей Гайдукевіч, лідэр ЛДП: Дзе там нашыя выбарцы?**

# БНФ склікае Канвэнт

**Вінцук Вячорка: «Партыя БНФ ініцыюе скліканьне пасьля другога туру выбараў Усебеларускага канвэнту дэмакратычных дэпутатаў усіх узроўняў. Калі ўжо яны прарваліся скрозь гэты фільтар, то ў іхнай пэрсанальнай легітымнасьці ня можна сумнявацца. Ім наканавана сфармуляваць патрабаваньні зьменаў у заканадаўстве — да тутэйшай афіцыйнай улады і да міжнародных структураў. Мы склічам усіх дэпутатаў, якія лічаць сябе дэмакратычнымі, на такі Канвэнт, напэўна — у другой палове сакавіка».**

## Меркаваньні дэпутатаў

**Алесь Галактыёнаў, Мсьціслаў, АГП:** Вышэйшае кіраўніцтва партый — і БНФ, і АГП — імкнецца выкарыстоўваць нас у сваіх інтарэсах. Ідэю, калі яна добрая, я падтрымаю. Але не хачу, каб лідэры за мой кошт падвышалі свой палітычны рэйтынг. На апошнім зьезьдзе АГП мне слова так і не далі. А такія адпрацаваныя палітыкі, як Чыгір і Марыніч, навабранцы партыі, выступалі — калі ласка. Аб’ядноўваць дэпутатаў трэба. Але кіраваць імі, навязваць сабе нешта новыя абраньнікі не дазволяць. Я апазыцыянэр і да ўлады, і да апазыцыі. Я за трэці шлях. Спадзяюся, што новыя дэпутаты яго і сфармулююць.

**Юры Губарэвіч, Белаазерск, беспартыйны:** Павінна найперш працягвацца праца па стварэньні новых канцэпцый мясцовага самакіраваньня — тое, чым раней займаўся Фонд Сапегі. Але калі ад такога Канвэнту будзе карысьць, удзел я гатовы браць.

**Алесь Міхалевіч, Мар’іна Горка, БНФ:** Трэба асацыяцыя дэпутатаў менавіта мясцовых саветаў, не ахопліваючы парлямэнту. Падставовая мэта — разьвіцьцё дэмакратычнага самакіраваньня. Але я гатовы браць удзел і ў шырэйшым Канвэнце.

**Валянціна Кудлацкая, Верхнядзьвінск, БСДП (НГ):** Чаму б не? Мясцовае самакіраваньне трэба рабіць рэальным. Каб ня быць дэкарацыяй для выканаўчай улады. Каб дэпутаты не былі адарваныя ад народу.

**Алесь Зарамбюк, Масты, «Малады фронт»:** Я гатовы. Такі Канвэнт павінен узначаліць нестары і харызматычны чалавек.

**Юры Зянковіч, Ждановічы, БНФ:** Такія напрацоўкі былі да выбараў. Цяпер Вінцук іх агучыў. Гэта добрая ідэя.

# Сяргей Чыслаў ваяваў уменьнем

**Датэрміновае галасаваньне ўжо ішло на ўсю моц, калі быў пазбаўлены рэгістрацыі кандыдат у дэпутаты Менгарсавету Сяргей Чыслаў. Маскоўская раённая выбарчая камісія зьняла яго з дыстанцыі «за зьнявагу і паклёп» у дачыненьні да прэзыдэнта Беларусі. Кандыдат дзівіцца, што зь ім «разабраліся» так позна.**

Сяргей Чыслаў балятаваўся па Ясенінскай акрузе №25. Яго спрабавалі зьняць з выбараў яшчэ на пачатку кампаніі. Але гарвыбаркам Сяргея ўсё ж зарэгістраваў: не было законных падставаў для адмовы. Хоць гэтая асоба ўладзе не падабалася. Сяргей Чыслаў — былы афіцэр, прэс-сакратар Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў. Ад 1995-га да 2001-га ён кіраваў незарэгістраванай арганізацыяй «Белы легіён». На выбары Чыслаў пайшоў як інжынэр унітарнага прадпрыемства «Тэхманал» ТАА «Беларускае таварыства інвалідаў». Ягонымі супернікамі былі галоўны лекар паліклінікі ды інжынэр замежнага прадпрыемства.

Каманда Чыслава дзейнічала «нетрадыцыйнымі мэтадамі» (калі не лічыць выключна расейскамоўных улётак). Былі запланаваныя тры сустрэчы з выбарцамі і, як кульмінацыя кампаніі, мітынг. На сустрэчы запрашаліся дырэктары школаў, крамаў, начальнікі ЖЭСаў, установаў. «Важна было сабраць эліту, людзей, якія маюць уплыў», — кажа Сяргей Антончык, давераная асоба Чыслава. На першую сустрэчу прыйшло больш за 40 чалавек, на другую — каля 80. Распавёўшы пра сваю праграму, Чыслаў наладзіў для выбарцаў прагляд дакумэнтальных фільмаў «Звычайны прэзыдэнт» і «Дзікае паляваньне». Ніхто зь іншых кандыдатаў у дэпутаты на такое не наважыўся, баючыся быць зьнятым з дыстанцыі.

27 лютага раённая выбарчая камісія пазбавіла С.Чыслава рэгістрацыі. Яго зьвінавацілі ў распаўсюдзе ўлётак у недазволеных месцах і ў зьнявазе ды паклёпе на прэзыдэнта. Апошні пункт беспрэцэдэнтны для выбарчай кампаніі. Намесьнік старшыні Цэнтравыбаркаму Лазавік, да якога прыехаў па тлумачэньні генэрал Фралоў, эмацыйна выказаўся на адрас сваіх падначаленых. Не таму, што шкадаваў Чыслава, а таму, што райвыбаркам перастараўся, стварыў палітычную справу.

«Мы сваёй мэты дасягнулі, — кажа Чыслаў. — Ведалі, што сьпісы дэпутатаў былі складзеныя «датэрмінова». Таму ішлі толькі займацца агітацыяй. У дадзеным выпадку гэта было адзінае мэтазгоднае выйсьце». Сяргей Антончык лічыць, што апазыцыйныя сілы любыя выбары мусяць праводзіць такім чынам, каб улада іх баялася: «Мы прапанавалі ёй свае правілы гульні. Галоўнай мэтай нашай агітацыйнай кампаніі было давесьці людзям, што мясцовыя выбары нічога не вырашаюць, што трэба зьмяніць палітычнае кіраўніцтва краіны».

На апошнюю сустрэчу з выбарцамі Чыслаў плянаваў сабраць 300—400 чалавек. У ёй мусілі ўзяць удзел дэпутаты палаты прадстаўнікоў Валеры Фралоў і Ўладзімер Парфяновіч, палкоўнік Уладзімер Барадач, лідэр прафсаюзу прадпрымальнікаў Анатоль Шумчанка, кінарэжысэр Юры Хашчавацкі. Зноўку зьбіраліся паказаць «Звычайнага прэзыдэнта». Аднак улады вырашылі паўтору «крамолы» не дапусьціць.

У гарадзкой выбарчай камісіі ўжо былому кандыдату С.Чыславу парадзілі надалей паказваць выбарцам патрыятычныя савецкія фільмы пра перамогу над фашызмам. «Будзем падаваць скаргу ў пракуратуру, — кажа Чыслаў. — Але толькі для таго, каб яшчэ раз пацьвердзіць, што ўлада нават ня думае пра дэмакратыю».

С.Чыслаў і надалей пляную займацца палітыкай. Ён лічыць, што прыток маладых сілаў у нацыянальны рух можа пераламаць сытуацыю. І Чыслаў, і Антончык адмаўляюць магчымасьць узьнікненьня ў бліжэйшы час новага палітычнага руху, хоць і пагаджаюцца, што ён патрэбны. Паводле іх словаў, гэты рух мусіць паўстаць ня штучна, «зьверху», а «на базе пратэставых груповак», «зьнізу». І людзі для гэтага павінны дасьпець.

**Сяргей Ёрш**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**На гэтых выбарах Сяргей Чыслаў дасягнуў пастаўленай мэты: правёў актыўную агітацыйную кампанію і паспрабаваў свае сілы як палітык.**

ВЫБАРЫ: ВОРША

# Перамог «Супраць усіх»

Як і скрозь, у Воршы вэртыкаль настойліва заклікала выбарцаў наведаць участкі для галасаваньня задоўга да 2 сакавіка. Так, 25 лютага «Аршанская газета» пісала: «Выбарчыя камісіі гораду і раёну запрашаюць на датэрміновыя выбары, якія пачаліся сёньня і будуць доўжыцца да 1 сакавіка».

Прымусова накіроўвала на ўчасткі работнікаў адміністрацыя найбуйнейшага ў горадзе прадпрыемства — ільнокамбінату. Майму знаёмцу-пэнсіянэру патэлефанавалі і прапанавалі прыслаць па яго машыну, каб адвезьці на ўчастак, хоць той знаходзіўся за дзьве хвіліны хады ад дому. Датэрмінова прагаласавалі і 219 салдатаў-навабранцаў адной з вайсковых часьцей.

Усяго на ўчасткі загадзя прыйшло каля 20% выбарцаў, а на некаторых участках, разьмешчаных ля льнокамбінату, — больш за 40% (СШ №7, 9, Палац культуры льнокамбінату). Тым ня менш, у артыкуле «Ісьці на выбары — наш абавязак» журналістка «АГ» заўважыла: «Нейкая частка грамадзян да выбарчых урнаў усё ж рушыць 2 сакавіка».

Большасьць кандыдатаў скарысталася магчымасьцю азнаёміць аршанцаў з сваімі праграмамі па мясцовым радыё. Але некаторыя гэтага не рабілі. Ці ў іх не было чаго сказаць, ці яны мяркуюць, што ў Воршы іх ведае кожны сабака? На жаль, з усіх кандыдатаў у «слугі народу» (як ад улады, так і ад апазыцыі) толькі адзін карыстаўся падчас агітацыі беларускай мовай — старшыня мясцовай арганізацыі ТБМ Юры Нагорны.

У Воршы ў галасаваньні ўзялі ўдзел 69% выбарцаў. На 30 месцаў у гарсавет абрана 11 чалавек (усе — «людзі ўлады»), сярод іх 6 пэдагогаў. У 10 акругах перамог кандыдат «Супраць усіх», у 9 адбудзецца другі тур галасаваньня. У адной акрузе сустрэнуцца старшыня суполкі АГП настаўнік Станіслаў Храпавіцкі і ўладальнік аршанскай гандлёвай «імпэрыі» «Мяркам» Мікалай Сінякоў. У другі тур выйшла і чацьвёрка сяброў БСДП (НГ). Супернікам аднаму зь іх будзе сябра ПКБ.

Па Аршанскім раёне прагаласавала 85,7% выбарцаў. На 37 дэпутацкіх месцаў абраны 34 чалавекі. У трох акругах выбары не адбыліся: там спаборнічалі сябры апазыцыйных партыяў. У райсавет трапіў адзін сябра ПКБ Васіль Шакуноў. Стаў дэпутатам і вядомы краязнаўца, настаўнік Барздоўскай школы Валеры Пячонкін. Ягонага канкурэнта, дырэктара гэтай школы, лідэра аршанскіх аўганцаў Уладзімера Кузьмянкова, зьнялі з дыстанцыі. Пракурорская праверка выявіла парушэньні падчас працэдуры вылучэньня. Не прайшоў у дэпутаты і кіраўнік аршанскага прадстаўніцтва БХК Васіль Берасьнеў.

Па шасьці выбарчых акругах ад Воршы ў Віцебскі аблсавет абраны адзін дэпутат. У дзьвюх акругах выбары не адбыліся. У Задняпроўскай, дзе балятаваўся лідэр мясцовых сацыял-дэмакратаў і прадпрымальнікаў Аляксандар Сталяроў, у другі тур выйшаў палкоўнік МНС зь Віцебску Аляксандар Ліпатаў. І гэта ня дзіўна. Доўгі час ён узначальваў Аршанскі атрад МНС — адзін з найлепшых у краіне. І ўмовы перадвыбарнай агітацыі яму стварылі самыя спрыяльныя. Адміністрацыі ўсіх установаў, якія спрадвеку баяцца інспэктараў супрацьпажарнага нагляду, расчынілі перад ім усе дзьверы. Так, у СШ №20 ён выступаў на агульным бацькоўскім сходзе, на нарадзе настаўнікаў. Ягоны вялізны стэнд быў разьмешчаны ў прыватнай краме — а гэта нібыта парушэньне пастановы гарвыканкаму аб месцах разьмяшчэньня агітматэрыялаў. Мясцовыя пажарнікі разносілі па кватэрах улёткі. Канкурэнткай яму будзе Натальля Кохава — дырэктарка школы-гімназіі №19, дзе тое ж МНС мае кадэцкія клясы.

У другі тур па Паўночнай акрузе выйшаў мясцовы мэдыямагнат, генэральны дырэктар ААТ «Тэлеком-Гарант» Георгі Капылоў, гадавы прыбытак якога летась склаў 23,5 млн. руб. Канкурэнтам будзе начальнік аддзелу ААТ «Воршабудматэрыялы», сябра ЦК ПКБ, дэпутат Вярхоўнага Савету XII скліканьня Мікалай Дзямідаў. Для параўнаньня: ягоны гадавы прыбытак склаў крыху больш за 2 млн. рублёў.

Хоць выбары праходзілі пад пільным кантролем выканаўчай улады, схаваць пратэставыя настроі ў грамадзтве не ўдалося. Галасаваньне «супраць усіх» — як прадстаўнікоў улады, так і апазыцыі — таму яскравае пацьверджаньне.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

# Уладзімер Парфяновіч:
# Мой ідэал – Кастусь Каліноўскі


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Уладзімеру Парфяновічу 44 гады. Ён на 4 гады маладзейшы за Лукашэнку і на 14 – за Пазьняка. Ён знакаміты спартовец-вясьляр, чэмпіён XXII Алімпійскіх гульняў, шматразовы чэмпіён Эўропы і сьвету, 17-разовы чэмпіён СССР, прэзыдэнт Асацыяцыі каноэ Рэспублікі Беларусі. Самы высокі дэпутат палаты прадстаўнікоў (194 см). На 4 см вышэйшы за Лукашэнку. Зь сярэдзіны 90-х займаецца бізнэсам. Прэзыдэнт ТАА «Беларускае агенцтва фінансавых інвэстыцый». Беспартыйны. У 2000 г. быў абраны дэпутатам палаты прадстаўнікоў па Кастрычніцкай выбарчай акрузе ў Менску. Жанаты, мае траіх дзяцей — двух сыноў і дачку. Старэйшы хварэе, сярэдні, 16-гадовы, вучыцца ў Рэспубліканскай школе алімпійскага рэзэрву (тэніс). Меншая ў нулёўцы. Бацька ў яго скончыў працоўную дзейнасьць будаўніком, маці – рабочаю на пафарбоўцы на Трактарным. Маці родам з Шаршуноў пад Радашкавічамі, бацька — з Далёкага (Глыбоччына).**

Працяг са старонкі 1.

**«НН»: Дэпутацкая група «Рэспубліка» ладзіла круглы стол «Незалежная Беларусь яднае нас». Ці задаволеныя Вы яго вынікамі?**

**У.П.:** Крыўдна, што там не было прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў. Калі яны так паважаюць прэзыдэнта, так адстойваюць яго пазыцыю, чаму ж не прыйшлі ды ня выказаліся? А як жа, паважаныя, вы будзеце далей адстойваць пункт гледжаньня прэзыдэнта? Вы што, яго здасьцё?

**«НН»: «Рэспубліка» стала апазыцыйнай групай?**

**У.П.:** Я так ня думаю. Мы па многіх пытаньнях падтрымліваем прэзыдэнта, па некаторых — не. Дык што, гэта «апазыцыйная група»? Альбо некаторыя цяпер кажуць: калі мы выйдзем разам зь людзьмі на марш «За лепшае жыцьцё», нас адразу запішуць у апазыцыянэры. Але ў чалавека мусіць быць свая пазыцыя. А ў нас прывыклі, што існуе толькі «пазыцыя партыі ды ўраду».

**«НН»: Як Вы ацэньваеце ролю апазыцыйных партый у сёньняшнім палітычным жыцьці?**

**У.П.:** Пакуль нашы партыі, акрамя лёзунгу «Далоў прэзыдэнта!», не высоўвалі канструктыўных прапановаў. Нічога не зрабілі, не адстаялі ніводнай пазыцыі. І сёньня некаторымі партыямі карыстаюцца як «страшылкамі»: адна «страшылка» большая, другая — меншая. Хацелася б, каб адышлі амбіцыі, старыя стэрэатыпы. Нават і ў адносінах з Расеяй.

**«НН»: Што Вы маеце на ўвазе?**

**У.П.:** Расея наш самы блізкі і надзейны сусед, зь якім працаваць і сябраваць трэба. Эканамічная супраца павінна быць. І трэба будаваць саюз, але ня з стратай сувэрэнітэту. Нават калі ствараўся СССР, быў прадугледжаны выхад зь яго. А дзе напісана ў праекце «канстытуцыйнага акту» пра выхад? Я разумею, што нешта створым, канстытуцыю зьменім, рэфэрэндум зладзім, хоць і не хацелася б...

**«НН»: Чаму?**

**У.П.:** Можа паўстаць пытаньне пра трэці тэрмін прэзыдэнцтва. Толькі тады мы збудуем дэмакратычнае грамадзтва, калі яно паўставаць ня будзе. Два тэрміны «паруліў», і досыць. Няўжо ў Беларусі сярод 10 мільёнаў грамадзянаў ня знойдзем вартага чалавека? Я пэўны на сто працэнтаў, што знойдзем. Калі будуем дэмакратычную дзяржаву, павінны строга трымацца гэтага прынцыпу.

**«НН»: Што для Вас азначае дата 25 Сакавіка?**

**У.П.:** Такая дата ў гісторыі была, і адмяжоўвацца ад яе ня варта. На фоне гэтай даты ў далейшым і ўзьнікла БССР. Гэта быў адзін з тых крокаў, дзякуючы якому і сёньня Беларусь лічыцца сувэрэннай дзяржавай.

**«НН»: Хто для Вас — гістарычны ідэал?**

**У.П.:** Кастусь Каліноўскі. Ён адзін з тых людзей, якія змагаліся за свабоду, але не змаглі яе здабыць. Яшчэ Васіль Быкаў — сумленьне нашай нацыі.

**«НН»: А Пазьняк?**

**У.П.:** Пазьняк мне не аўтарытэт.

**«НН»: Вы назіралі за мясцовымі выбарамі ў Менску. Як уражаньні?**

**У.П.:** На адных участках, якія мы, дэпутаты «Рэспублікі», наведвалі, праблемаў не было, але на іншых, калі прасілі пратакол, сутыкаліся зь вялікімі перашкодамі. Па адной выбарчай акрузе ў Серабранцы мы маем пратаколы з аднымі лічбамі, а ў выбарчую камісію былі прывезеныя зусім іншыя. Сябры камісіі не баяцца крымінальнай адказнасьці. Але мы гэта так не пакінем, будзем падаваць скаргу ў пракуратуру.

**«НН»: Ці можна зьмяніць гэтую сытуацыю? Наперадзе ж парлямэнцкія выбары.**

**У.П.:** Мы падрыхтавалі зьмены ў выбарчы кодэкс. Але, каб іх правесьці, нам трэба 75% галасоў дэпутатаў палаты. Інакш зьмены можа адхіліць верхняя палата і прэзыдэнт. Даб'ёмся — будзе вынік, не даб'ёмся — ня будзе.

**«НН»: Але ж Вы зь лёгкасьцю выйгралі выбары ў палату.**

**У.П.:** Першыя — лёгка. Першы алімпійскі мэдаль даецца лягчэй, чым другі. І з другімі выбарамі будзе тое самае.

**«НН»: Як Вы ацэньваеце тое, што Лукашэнка не прыехаў удзельнічаць у выбарах?**

**У.П.:** Вядома, прэзыдэнту адпачынак патрэбны. Хоць у час, калі краіна робіць вельмі сур'ёзны крок, ён павінен быў галасаваць разам з сваёй сям'ёй. Але, бачыце, не прагаласаваў.

**«НН»: А што дэпутат Парфяновіч робіць у часе адпачынку?**

**У.П.:** Вельмі складана з вольным часам. Хочацца выехаць на прыроду, на рыбу, пакатацца на лыжах. На горных, пажадана. Летась гэта ўдалося, а сёлета не хапіла часу. Найлепшы адпачынак — гэта менавіта горныя лыжы. Іх нават з адпачынкам на моры не параўнаеш, бо там пасіўны адпачынак, а на лыжах — вельмі актыўны.

**«НН»: Спадару Парфяновіч, дык што ж штурхнула Вас у палітыку?**

**У.П.:** Памятаю, некалі ў зборнай Саюзу на зборах абвяшчаў галадоўку праз тое, што нас дрэнна кармілі. Спачатку ўзьнікла жаданьне адстойваць інтарэсы сваіх сяброў, а пасьля — інтарэсы грамадзянаў у больш высокім узроўні.

**«НН»: Дзе прасьцей — у вялікай палітыцы ці ў вялікім спорце?**

**У.П.:** У спорце складана фізычна і псыхалягічна. А ў палітыцы атрымліваеш маральныя траўмы. Калі дзяржава багатая, калі можа забясьпечыць добрае жыцьцё грамадзянам, тады і палітыкай прасьцей займацца. Вось як у Фінляндыі, Нарвэгіі. А ў нас няма грошай ні на што. Напрыклад, каб пачысьціць возера Лошыцу ў Кастрычніцкім раёне. Даводзіцца зьбіраць тысячу подпісаў грамадзян і пасьля выступаць у парлямэнце і гаварыць, што я, як дэпутат, маю намер падаць у суд на ўрад. Праблема вырашаецца цягам двух тыдняў. Зьяўляецца дакумэнт за подпісамі віцэ-прэм'ера Дражына, мэра Паўлава, міністра Харужыка. Такая вось бяда — беларуская палітыка.

**«НН»: Ці возьмуць нашыя спартоўцы столькі залатых мэдалёў на Алімпіядзе, колькі «замовіў» прэзыдэнт міністру спорту і турызму?**

**У.П.:** Не. Гэтая задача ня будзе выкананая. Зрэшты, гледзячы як прэзыдэнт будзе лічыць. Калі выйграем у акадэмічным веславаньні-васьмёрцы — гэта восем залатых мэдалёў, а ў турнірнай табліцы будзе толькі адзін.

**«НН»: Ці не баіцёся, што фальсыфікацыі на наступных выбарах зьвядуць плён усёй Вашай дзейнасьці на нішто?**

**У.П.:** Найвышэйшай уладай у нас зьяўляецца народ. І калі ён захоча, усё зробіць. Захоча жыць лепш — будзе жыць лепш.

**Гутарыў Алег Тачоны**

## Полацак прымаў дзяржсакратароў

**4—6 сакавіка ў старой сталіцы Беларусі** адбылася сустрэча сакратароў радаў бясьпекі Беларусі, Польшчы, Украіны і Расеі. Беларускую дэлегацыю ачольваў Генадзь Нявыглас. Сустрэча ў такім складзе адбылася ўпершыню.

## Зьезд інтэлігенцыі: што новага

**Каля 400 дэлегатаў ужо вылучана на Ўсебеларускі сход інтэлігенцыі, што адбудзецца 16 сакавіка ў палацы «Сукно».** Ад Менску прапанавана 230 прадстаўнікоў. Квоты абласьцей павялічаныя да 100 дэлегатаў. Кожны ўдзельнік сходу мусіць здаць арганізацыйны ўнёсак у памеры 5 тысяч рублёў. Адрас аргкамітэту форуму: вул.Румянцава, 13, Менск, 220005. Тэл./факс: (017) 284-85-11.

## Парлямэнцкі крызыс у Польшчы

**У Польшчы пры канцы мінулага тыдня развалілася ўрадавая кааліцыя Саюзу левых дэмакратаў (SLD) і Уніі Працы (UP), а таксама сялянскай Польскай народнай партыі (PSL).** Дэпутаты ад PSL выказаліся ў Сойме супраць увядзеньня новага дарожнага падатку. Тады дэпутаты ад SLD-UP заявілі, што далейшае існаваньне кааліцыі немагчымае, бо PSL увесь час спрабуе штосьці для сябе вытаргаваць. Цяпер для падтрымкі ў Сойме кабінэту Лешка Мілера не хапае 19 галасоў, якія польскі прэм'ер зьбіраецца шукаць сярод незалежных дэпутатаў. Калі ўрад ня зможа іх пераканаць, Польшчу чакаюць датэрміновыя парлямэнцкія выбары.

## Курды супраць туркаў

**Каля 500 тыс. іракскіх курдаў выйшлі 3 сакавіка на маніфэстацыю пратэсту супраць магчымага ўводу турэцкіх войскаў на іх тэрыторыю.** Курды ад 1991 г. жывуць аўтаномна ад Багдаду. Яны баяцца, што ЗША «здадуць» іх туркам за дазвол атакаваць Ірак з турэцкіх базаў. У выпадку турэцкай інтэрвэнцыі курды абяцаюць узяцца за зброю.

**СМ**

Наша Ніва

Нагадваем, што падпіску на другі квартал прымаюць да **15 сакавіка**. Падпісны індэкс **63125**. Цана падпіскі на месяц — **2043** рублі. На шапік «Белсаюздруку» — усяго **1360** рублёў. Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку».



Дык падпісвайся!

# Маркевіч на волі



IREX-PROMEDIA

**Галоўнаму рэдактару газэты «Пагоня» Міколу Маркевічу 4 сакавіка зьмянілі меру пакараньня. У сераду ў Менску Мікола ўжо вольным даў прэс-канфэрэнцыю для журналістаў. Рэшту свайго тэрміну (360 дзён) ён будзе працаваць у Горадні ды сплачваць дзяржаве 15% ад заробку.**

## Срэбныя сторублёвікі

**Нацбанк выпусьціць 100-рублёвую срэбную манэту, прысьвечаную балету.** У аснову яе дызайну ляжа сцэна з «Рагнеды», прызнанай у 1996 г. найлепшым балетам сьвету. Кожная з 500 манэтаў будзе важыць 155,5 г.

## Перамаглі й без Сашурына

**13 мэдалёў — 1 залаты, 7 срэбных і 5 бронзавых — прывезьлі біятляністы з чэмпіянату Эўропы.** Найболей шанцавала нашай зборнай у эстафэтах. «Перацягнутыя» расейскія спартоўцы адпрацавалі як трэба.

## Менск расьце

**27 лютага Менгарсавет прыняў пастанову аб пашырэньні тэрыторыі Менску.** У межы гораду ўвойдуць 3 тыс. 867 гектараў «новай зямлі». Да 2010 г. на іх будуць збудаваныя мікраараёны Каменная Горка, Навінкі, Сухарава-4, -5, Красны Бор-1 на 130 тыс. чалавек.

## Абаронім вераб'я

**Суполка «Ахова птушак Беларусі» распачала літаратурныя і мастацкія конкурсы, прысьвечаныя хатняму вераб'ю — птушцы 2003 г.** Кампанія мае прыцягнуць увагу грамадзкасьці да праблемы захаваньня птушак. Сёлета з ініцыятывы АПБ у краіне адбываецца агульнанацыянальны ўлік вераб'ёў. Пра ўмовы конкурсаў можна даведацца праз e-mail APB@tut.by ці праз т. 263-06-13.

## Раздача сланоў

**26 лютага беларускія рэкламісты падсумоўвалі вынікі году на нефармальнай «Раздачы сланоў».** Летась нашыя агенцыі ўзялі прызы на прэстыжных конкурсах у Славеніі, Расеі, Украіне, Латвіі. Найболей узнагародаў маюць «Bates Primary Saatchi&Saatchi», «Белая Карона», «Forte Grey» і «D'Arcy Partisan». ТВ-ролік апошняй фірмы, «Жанчыны», трапіў у тэлешоў BBC «Самыя сьмешныя ролікі сьвету».

## Самагонцы ў крамах — «так!»

**Дэпутаты літоўскага Сойму падрыхтавалі законапраект аб легалізацыі вытворчасьці і продажу самагонкі.** Паводле праекту, на гэта можна будзе атрымліваць спэцыяльную ліцэнзію. Пры гэтым спасылаюцца на аўстрыйскі прыклад. Супраць рашуча выступае экспрэзыдэнт Валдас Адамкус, хоць самагонку, як прызнаецца, і ён піў неадназова.

## За геніталіі — у суд

**У Гданьску йдзе судовы працэс у справе мастачкі Дароты Нянянскай, якая ў часе сваёй выставы прэзэнтавала скульптурную кампазыцыю** ў выглядзе крыжа з прычэпленымі мужчынскімі геніталіямі. Выставу адразу зачынілі, а мастачцы пагражае два гады турмы «за абразу рэлігійных пачуцьцяў».

**«НН»; Аляксей Дзікавіцкі, Варшава; БелаПАН; радыё «Свабода»; «Gazeta Wyborcza»; «Газета.ru»**

## ХРОНІКА ЎЦІСКУ

30 студзеня гарадзенскі мастак **Зьміцер Іваноўскі** быў асуджаны на 15 начаў арышту. Яго абвінавацілі ў арганізацыі несанкцыяванага мітынгу прадпрымальнікаў. З.Іваноўскі, абураны несправядлівасьцю, абвясьціў галадоўку папросту ў залі суду. Ён казаў, што людзі прыйшлі на пляц самастойна. 6 лютага сябру віцебскай арганізацыі КХП-БНФ **Уладзімеру Плешчанку** далі 150 базавых адзінак (1.850.000 рублёў) штрафу «за арганізацыю несанкцыяванага пікету» 20 студзеня, падчас візыту ў Беларусь расейскага прэзыдэнта Ўладзімера Пуціна. Сябра КХП-БНФ **Аляксандар Салаўян** за ўдзел у тым самым пікеце атрымаў судовае папярэджаньне. 24 лютага абодва сябры КХП-БНФ ізноў былі затрыманыя. 10 лютага гомельскага «зуброўца» **Дзяніса Чыкалёва** схапілі папросту на вуліцы. Яго завезьлі ў нейкі будынак, дзе дзьве гадзіны дапытваліся пра марш «За лепшае жыцьцё!». 14 лютага, падчас несанкцыяванага шэсьця, былі затрыманыя 5 маладафронтаўцаў і журналіст **Вадзім Доўнар** (былы сябра МФ). Непаўналетняга **Алега Гнедчыка** (16 гадоў) пратрымалі ўсю ноч у пастарунку і адпусьцілі, а астатніх асудзілі. **Алег Мядзьведзеў** засьведчыў, што начальнік Савецкага РУУС Мікалай Бусло нецэнзурна абражаў яго і біў на допыце. Юнак мае падаць скаргу ў пракуратуру. Ён быў асуджаны на 7 сутак арышту, як і **Зьміцер Філіповіч**. **Павал Севярынец** і **Артур Фінькевіч** (якому за 3 дні да затрыманьня якраз споўнілася 18 гадоў) асуджаныя на 10 сутак арышту, **Пятрусь Кеўлаў** атрымаў 5 сутак. 14 лютага ў БДУІР напярэдадні прыезду А.Лукашэнкі міліцыянты затрымалі сябра Беларускай партыі свабоды **Ільлю Ядранцава** — за бел-чырвона-белую нашыўку на куртцы. Пратакол склалі «за дробнае хуліганства», і 25 лютага І.Ядранцава прысудзілі да штрафу ў памеры 2 базавых велічыняў. 14 лютага за распаўсюд улётак былі затрыманыя «зуброўцы» **Вераніка Купчанка**, **Аляксей Ляўковіч, Павал Юхневіч** і **Яўген Афнагель**. На двух апошніх склалі пратаколы «за парушэньне правілаў добраўпарадкаваньня населеных пунктаў». Паводле інфармацыі Праваабарончага цэнтру «Вясна», 12 лютага сакратарка Гомельскай гарадзкой тэрытарыяльнай камісіі Юлія Дзенісенка адмовілася друкаваць па-беларуску біяграфічныя зьвесткі пра кандыдатаў у дэпутаты гарсавету Івана Яцкова і Андрэя Баранава. Абгрунтавала яна гэта тым, што ўсе іншыя кандыдаты напісалі зьвесткі для агульнага плякату па-расейску і дзеля двух чалавек камісія ня будзе рабіць выключэньне. 24 лютага за расклейку ўлётак, прымеркаваных да маршу «За лепшае жыцьцё!», у Менску былі затрыманыя 4 сябры руху «Зубр»: **Ігар Віньнікаў, Аляксандар Паўловіч, Ягор Баброў, Сяргей Папоў**. У І.Віньнікава міліцыянты забралі пашпарт, паабяцаўшы аддаць толькі пасьля выплаты штрафу. 24 і 25 лютага ў Віцебску за несанкцыянае пікетаваньне ў пастарунак патрапіў **Барыс Хамайда**. 25 лютага за расклейку ўлётак у Менску «зуброўца» **Андрэя Чачоткіна** затрымалі міліцыянты. 25 лютага ўначы ў Смургонях падчас расклейкі ўлётак з заклікам да байкоту выбараў быў затрыманы сябра Сойму КХП-БНФ **Віктар Шоць**. 25 і 26 лютага менскія міліцыянты затрымлівалі ўдзельніцу руху «Зубр» **Тацяну Яловую**, якая распаўсюджвала спэцвыпуск газэты «Зубр». 26 лютага за тое самае ў міліцыю патрапілі **Павал Юхневіч, Максім Артамонаў, Тацяна Паўловіч,** а таксама **Вячаслаў** і **Віталь** (прозьвішчы невядомыя). 27 лютага на чыгуначным вакзале Менску была затрыманая старшынька Магілёўскай абласной арганізацыі БСДП (НГ) **Аксана Бярнацкая**, якая везла 5.000 улётак з заклікам байкоту акругаў, дзе ўлады зьнялі дэмакратычных кандыдатаў. Міліцыянты склалі пратакол на А.Бярнацкую і канфіскавалі ўлёткі. 28 лютага за раздачу газэты «Зубр» у Менску быў затрыманы актывіст руху **Сяргей Рыкаў**. На яго склалі пратакол, забралі дакумэнты і асабістыя рэчы, якія аддалі толькі 2 сакавіка. У ноч на 1 сакавіка ў Берасьці былі затрыманыя «зуброўцы» **Паліна Панасюк** і **Павал Хівук**, якія расклейвалі ўлёткі «Он должен уйти!». На затрыманых склалі пратаколы за «парушэньне правілаў правядзеньня масавых мерапрыемстваў» і адпусьцілі. П.Хівука дадаткова завезьлі ў пастарунак зранку і склалі другі пратакол — па арт. 172. У Барысаве 2 сакавіка падчас раздачы незарэгістраванай газэты «Зубр» былі затрыманыя ўдзельнікі руху — непаўналетнія **Яўген Сіліч** і **Сяргей Лукашонак**. У Менску за тое самае схапілі **Любоў Кучынскую** і **Аляксея Ляўковіча.** Міліцыянты нават не складалі пратаколаў, папросту адабралі газэты. 3 сакавіка менскія міліцыянты затрымалі «зуброўцаў» — распаўсюднікаў газэты **Марыну Карвін-Кучынскую, Ірыну Бохан, Андрэя Шыткова** і **Аляксандра Лазарэнку**. 4 сакавіка ў Менску за тое самае трапілі ў пастарунак **Ганна Ягорава** ды **І.Бохан**.

**АВ, СМ**

## З УСЁЙ КРАІНЫ

## Невядомы апарат глушыць БТ

**З канца мінулага году ад аршанскіх карыстальнікаў кабэльнага тэлебачаньня сталі паступаць скаргі: няякасна йдуць праграмы БТ.** Мясцовыя спэцыялісты выявілі, што ў раёне льнокамбінату існуе невядомая пакуль моцная перашкода для тэлесыгналу, якая не дазваляе рабіць якасную карцінку на тэлеэкране. Гэтую перашкоду шукалі як аршанскія спэцыялісты, так і запрошаныя на дапамогу інспэктары электрасувязі зь Віцебску. Але пошукі былі безвыніковыя. Мо хтосьці з жыхароў карыстаецца вельмі моцным радыётэлефонам або якімсьці апаратам. Злавіць зламысьніка пакуль ня могуць.

## Мірон на лыжах

**Некалькі дзён ля аднаго з дняпроўскіх мастоў у Воршы на засьнежаным лёдзе можна было прачытаць «Жыве Беларусь!».** Паўтараметровыя літары зрабіў нейкі лыжнік-рызыкант, бо лёд ля берагоў добра падтаў. І толькі сьнег, які выпаў, зацярушыў надпіс.

**Віктар Лютынскі, Ворша**

## Самасёлы

**Гаспадар А. працуе брыгадзірам у калгасе імя Леніна, што на Івацэвіччыне.** Яго жонка — настаўніца Гошчаўскай школы. Гадуюць дзяцей (дзесяць, восем і пяць гадоў). З 1995 г. яны стаялі ў чарзе на атрыманьне жылля. А пасьля па вёсцы папаўзьлі чуткі: калгас будзе даваць кватэры толькі тым сем'ям, дзе і мужык, і жонка працуюць у гаспадарцы. А. сабралі рэчы ды самавольна засяліліся ў пусты дом, адкуль выехалі ранейшыя жыхары.

Такі выбрык разьюшыў кіраўніцтва калгасу. Самавольнікам адключылі электрычнасьць і газ, спрабавалі ламаць дзьверы, пагражалі. Да суду Лінча справа не дайшла — яна дайшла да суду раённага. Канфліктную сытуацыю будзе разглядаць мясцовая Фэміда, што атрымала ад праўленьня калгасу заяву аб высяленьні сям'і з казённага жытла.

## Івацэвіччына ў агні

**Позна ўвечары вёска Альшаніца, што на Івацэвіччыне, асьвятлілася полымем пажару.** Гарэў дом сям'і Л. Гаспадар з дачкой быў у Белаазерску. Дома заставалася гаспадыня з трохгадовым сынам. Целы маці і хлопчыка знайшлі на папялішчы. Кабета была неабыякавай да сьпіртных напояў, смаліла цыгарэты і лічылася найлепшай прыяцелькай для тутэйшых лавэласаў і выпівохаў. Часьцяком, калі мужык ірваў жылы на фэрме, яго хата ходырам хадзіла ад п'янкі-гулянкі. Маладую жанчыну зьбіраліся пазбавіць бацькоўскіх правоў. Не пасьпелі.

За тыдзень на Івацэвіччыне падчас пажараў загінулі адразу трое мужчынаў зь вёсак Дабрынёва, Жытлін і райцэнтру. Для іх ланцужок «выпіў — закурыў — заснуў» скончыўся трагічнай сьмерцю.

**Алесь Лаўранюк, Івацэвічы**

## Дызэнтэрыя ў Крычаве

**Работнікі Крычаўскага заводу гумовых вырабаў масава захварэлі на дызэнтэрыю.** Двое зь некалькіх дзясяткаў шпіталізаваных — у цяжкім стане. Палачкі дызэнтэрыі выпадкова трапілі ў заводзкі водаправод, што й сталася прычынай эпідэміі.

**Андрэй Кузьмін, Крычаў**

## Самагоншчыкаў заклалі

**У вёсцы Дараганава, што на Асіповіччыне, з насельніцтвам каля 550 чалавек, падчас аперацыі «Самагон» выяўлена 18 кропак самагонаварэньня.** Мясцовыя жыхары пэўныя, што міліцыянты дзейнічалі па «наводцы», бо, заходзячы ў чарговую хату, дакладна ведалі, дзе стаіць апарат і колькі прадукту выраблена. Некаторыя з пакрыўджаных паабяцалі адпомсьціць пільнаму аднавяскоўцу.

**Рыгор Латышэвіч, Асіповічы**



IREX-PROMEDIA

**Міліцыя ліквідоўвае «пункт самагонаварэньня» на Гарадзеншчыне.**

## ЗАЯВА РАДЫ БЕЛАРУСКАГА ПЭН-ЦЭНТРУ

**Рада РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар» выказвае рашучы пратэст супраць фактычнага закрыцьця газэтаў «Новая газета Сморгони» і «Вечерний Столин».** Гэтыя крокі скіраваныя на здушэньне свабоды слова і запалохваньне іншых рэгіянальных СМІ. Падобная палітыка несумяшчальная з прынцыпамі дэмакратыі. Заклікаем рэдактараў, журналістаў зачыненых СМІ, літаратараў рабіць і надалей усё магчымае, каб свабоднае слова даходзіла да чытачоў. Змагайцеся за адмену рэпрэсіўных рашэньняў, настойліва рэгіструйце новыя газэты, друкуйце выданьні, якія не патрабуюць рэгістрацыі.

# Піва ў банках

**Напярэдадні паездкі прэм'ера Генадзя Навіцкага ў Маскву Савет Міністраў абмеркаваў пэрспэктывы піваварнай галіны. Яе галоўным спонсарам прызначылі «Прыёрбанк». Пратэстаў расейскіх піваравараў з нагоды ўведзеных Менскам абмежаваньняў Саўмін не разглядаў.**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Імпарт піва з Расеі ў Беларусь абмяжоўваецца беларускімі ўладамі, а пратэсты расейскіх піваравараў застаюцца без адказу.**

Прэзыдыюм Саўміну ў аўторак абмеркаваў структурную перабудову піваварнай галіны. Прэм'ер прапанаваў якасна новыя падыходы да яе разьвіцьця: акцыяваныя беларускія бровары мусяць перадаць пакеты сваіх акцыяў банкам. Для большыні піўзаводаў такім інвэстарам стане «Прыёрбанк», які, паводле ўрадоўцаў, сам захацеў фінансаваць разьвіцьцё беларускай піваварнай прамысловасьці.

Нядаўна палову акцыяў самога «Прыёрбанку» набыў аўстрыйскі «Райфайзэнбанк».

Выступаючы на паседжаньні прэзыдыюму Саўміну, першы віцэ-прэзыдэнт канцэрну «Белдзяржхарчпрам» Аляксей Рубец распавёў, што ўсе беларускія піўзаводы падзеляць на пяць групаў. Першая будзе складацца з згаданай «Крыніцы», «Берасьцейскага піва», бровара «Дзеднава», Слуцкага піўзаводу, а таксама магілёўскага прадпрыемства. Усе яны перададуць частку сваіх акцыяў, што належаць дзяржаве, у карыстаньне «Прыёрбанку». Цягам двух гадоў гэты банк мяркуе інвэставаць у рэканструкцыю бровараў каля 60 млн. даляраў. Перададзеныя «Прыёрбанку» бровары будуць вырабляць каля 60% усяго піва Беларусі, ці 345 млн. літраў на год.

Іншыя групы бровараў банкаўскай падтрымкі мець ня будуць. «Лідзкае піва» й менская «Аліварыя», якія дзяржаўнай долі ня маюць, мусяць разьвівацца коштам уласных сродкаў. А бровары Віцебскай вобласьці, Горадні й Маладэчна пакуль увогуле неакцыяваныя.

Асаблівае месца ў піваварнай галіне атрымае фірма «Белсолад», якая будзе цалкам забясьпечваць бровары соладам і ячменем. Прычым з кожным годам будзе ўзрастаць доля мясцовай, беларускай сыравіны.

Савет міністраў разьлічвае на тэхнічнае пераўзбраеньне піўзаводаў, паляпшэньне якасьці напояў і зьяўленьне новых гандлёвых марак. Да перабудовы бровараў могуць далучыцца таксама іншыя банкі. Прэм'ер Генадзь Навіцкі даручыў распрацаваць плян разьвіцьця галіны цягам месяца, але на 20 сакавіка прызначаны візыт Аляксандра Лукашэнкі на менскі піўзавод «Крыніца», таму канчатковы плян будзе сфармуляваны там.

Адметна, што пра ўдзел расейскай кампаніі «Балтыка» ў рэканструкцыі «Крыніцы» на саўмінаўскім паседжаньні ня згадвалася. Таксама абышлі ўвагай нядаўні зварот саюзу расейскіх піваравараў з пратэстам супраць шматлікіх абмежаваньняў на імпарт піва з Расеі ў Беларусь. Затое беларускі ўрад абяцае сваім броварам ільготы на імпарт абсталяваньня, а таксама нулявы акцыз на безалкагольнае піва ды зьменшаны падатак на дададзеную вартасьць.

Гэтыя рашэньні стануць новым адказам на просьбы кіраўніцтва Расеі даць расейскім вытворцам піва магчымасьць рэалізоўваць сваю прадукцыю ў Беларусі. На гэтым тле прэм'ер-міністар Навіцкі будзе сустракацца ў сераду ў Маскве з сваім расейскім калегам Міхаілам Касьянавым.

**Юры Сьвірко, радыё «Свабода»**

# Кава з прысмакам вайны

**Ад псыхозу вакол вайны з Іракам выйграюць ня толькі нафтавыя магнаты, але і ўладальнікі кававых плянтацыяў. Чакаецца падаражаньне кавы.**

Цяпер вытворцам кавы даводзіцца цяжка. Цэны на іх прадукт упалі да 65 цэнтаў за фунт. Рэкордна малой цаны — 55 цэнтаў за фунт — дасягнула цана кававых зярнят на біржы ў Нью-Ёрку. Прычым сабекошт фунту кавы складае 75—77 цэнтаў.

Прычына падзеньня цэнаў — перавытворчасьць. Большасьць краінаў, у якіх вырошчваюць кававыя бабы, аніяк не кантралююць аб'ёмаў вытворчасьці. Сусьветны рынак перапоўнены каваю, выробленай пяцьцю найбуйнейшымі карпарацыямі: «Kraft», «Procter&Gamble», «Nestlé», «Tchibo» і «Sara Lee».

Аднак хутка сытуацыя мусіць зьмяніцца. Па-першае, дзьве галоўныя «кававыя краіны» — Бразылія ды Калюмбія — зьменшылі вытворчасьць дзеля неспрыяльнай сытуацыі на рынку. Па-другое, попыт на каву мусіць значна падвысіцца. Аналітыкі зьвязваюць надзеі з амэрыканскім рынкам кавы. Калі пачнецца вайна з Іракам, павялічыцца небясьпека тэрактаў у ЗША. Амэрыканцы будуць значна больш часу бавіць дома — значыцца, узрасьце попыт на каву як сродак зьняць стрэс у хатняй абстаноўцы. Прагназуюць, што сёлета цэны на каву падвысяцца да 85—90 цэнтаў за фунт.

**Алесь Кудрыцкі**



**Кожны жыхар Беларусі спажывае 3,6 кубачка кавы на год. Для параўнаньня: паказьнік спажываньня гарбаты складае 288 кубачкаў на чалавека ў год. Сусьветны лідэр продажу — зьмеленая кава, аднак у нас болей любяць распушчальную.**

## Буйная ўгода на музычным рынку

**Кампанія «West Records» заключыла найбуйнейшую за ўсю гісторыю беларускага музычнага рынку ўгоду.** Яна набыла правы на продаж 500 найменьняў CD з каталёгу сусьветна вядомага лэйблу «Universal Music». Каштаваць ліцэнзійныя дыскі будуць 7 тыс. — не нашмат больш за пірацкія копіі. З 2 красавіка «West Records» пачне адсочваць прадаўцоў нелегальных копіяў з каталёгу «Universal Music». Крамы маюць месяц на тое, каб пазбыцца пірацкага тавару.

## «Время» №0

**Выйшаў нулявы нумар аршанскай газэты «Время» (на расейскай і беларускай мовах зь перавагай першай).** Яе заснавальнік і выдавец — прыватны выдавецкі дом «Время», зарэгістраваны ў Менску Паўлам Жуком (усе спробы займець юрыдычны адрас у Воршы былі дарэмныя). Друкаваць газэту ў мясцовай друкарні адмовіліся. Рабілі яе ў Смаленску. Якасьць друку там кепская. Наклад газэты — 1000 асобнікаў, распаўсюджвалася яна бясплатна. Большасьць аўтараў — былыя супрацоўнікі вэртыкальнай «Аршанскай газэты».



УЛАДЗІМЕР ШЛАПАК

**Павал Жук замест «Нашай свабоды» хоча выдаваць «Время»**

## Сьмецьцезавод

**Нямецкая фірма «Аграгаз» зьбіраецца пабудаваць у Менску першы ў Беларусі завод па перапрацоўцы цьвёрдых адкідаў.** Утылізацыя будзе наладжаная найбольш рацыянальным — бескіслародным спосабам. Г.зн. сьмецьце ня будуць паліць. Немцы зьбіраюцца інвэставаць у будаўніцтва заводу 10 млн. эўра.

## Нарматыўны акт пра дэгустацыю

**Урад дазволіў бізнэсоўцам ладзіць рэклямныя дэгустацыі моцных напояў.** Дэгуставаць алкаголь на прадпрыемствах, у крамах ды кропках грамадзкага харчаваньня змогуць толькі бізнэсоўцы, якія маюць ліцэнзію на гандаль алкаголем. Масавыя дэгустацыі можна ладзіць на спэцыялізаваных выставах ці кірмашах. Дэгустатары мусяць мець ня менш за 18 гадоў. Наліваць у кілішак дазваляецца ня больш за 30 грамаў напою. Раней дэгустацыі магла рабіць толькі цэнтральная дэгустацыйная камісія.

## Урад рыхтуе зьмены ў заканадаўстве

**Права «залатой акцыі» будзе абмежаванае.** Праект адпаведнага прэзыдэнцкага ўказу падрыхтавала Мінэканомікі. Паводле яго, «залатую акцыю» можна будзе ўводзіць толькі на стратэгічных прадпрыемствах. Іх сьпіс будзе складаць прэзыдэнт. Яшчэ «залатую акцыю» будзе дазволена ўводзіць у акцыянэрных таварыствах, якім пагражае банкруцтва.

Урад зьбіраецца адмяніць забарону на продаж дзяржаве акцыяў, якія набылі супрацоўнікі прыватызаваных прадпрыемстваў за чэкі «Маёмасьць». Дзяржава зноў можа ўзяць пад кантроль navaстораныя акцыянэрныя таварыствы, якія маюць запазычанасьць перад бюджэтам. Афіцыйна дэкляраваная мэта — гэта дапамога пазьбегнуць банкруцтва некаторым прадпрыемствам.

## Усе шапікі прыбяруць

**Менгарвыканкам пляную да 1 ліпеня прыбраць з вуліцаў сталіцы ўсе камэрцыйныя шапікі.** Іх уладальнікам прапанавана ісьці ў гіпэрмаркеты ці будаваць уласныя крамы. Пабудаваць краму каштуе каля 50 тыс. даляраў, штомесячная арэнда за месца ў гандлёвым цэнтры — 1,5 тыс. Прадпрымальнікі зьбіраюць подпісы на знак пратэсту.

**АК; Віктар Лютынскі; БелаПАН**

## Чытайце ў наступных нумарах газэты

**«Раз, два, тры — яднаеш ты».** Валеры Грыцук, Ян Абадоўскі, Валеры Кругавы і іншыя кожны сам па сабе кансалідуюць беларускую эміграцыю ў Польшчы, а Зянон Пазьняк ім ня верыць. **«Беларуская душа патрабуе гітары»** — гутарка з Алесем Камоцкім. Вас чакаюць таксама гутаркі — **Лявонам Вольскім** і **Зьмітром Вайцюшкевічам**. **«Невядомая БНР»** — цяжкія роздумы Кастуся Езавітава і адэскія прыгоды консула Некрашэвіча. **Навука**: знаёмства з маладой дасьледніцай-радыёлягам Аксанай Бараноўскай, што абараняе дысэртацыю па-беларуску. **Раскол у NATO... выдуманы** — спрэчкі вакол ірацкага крызысу. **Як запабегчы трасянкі** — паласа культуры мовы.

# 7 сакавіка пятніца

**● БТ**
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.15 «Сяброўка Восень». Сэрыял. Заключная сэрыя.
9.10, 17.05 «Шчасьлівая краіна». Сэрыял. Заключная сэрыя.
10.05 Сад мары.
10.30 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.55 Кухня КВК.
11.10, 22.00 «Магія каханьня»
12.15, 14.35 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Камэдыя «Тры жанчыны і мужчына». («Беларусьфільм»).
15.15 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.40 Пяць цудаў.
15.50 «Гэта кляса!». Моладзевы сэрыял.
16.20 5х5.
19.10 Камэдыя «Жаніцьба Бальзамінава».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Ікс.
23.15 Мэлядрама «Каханак».

**● СТВ**
5.00 Музычны канал.
5.30, 14.35 «ЗБЖ, ці...». Тэлесэрыял.
6.00, 16.00 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.25, 15.30 «Джым Батан». Мультсэрыял.
6.50, 15.00 «Інспэктар Гаджэт». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.25, 13.30, 16.30, 19.30, 22.35 «24 гадзіны».
7.45, 20.05 «СТВ-спорт».
7.55 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.00 «Менск і менчукі».
8.05, 22.55 «Тэхналёгія».
8.15 Кіно: прыгодніцкі фільм «Капітан Гарацый». ЗША, 1951.
10:10 «Гульнявы рэфлекс».
10.20 «Запрашаем паскардзіцца».
10.30 «Пад вуглом 23 з паловай». Дак. фільм.
11.00, 20.30 «Аўтапанарама».
11.15 «Тэатральныя гісторыі».
11.30 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.30 «Сямейныя страсьці». Ток-шоў.
13.45 «Па той бок ваўкоў». Тэлесэрыял. Заключная сэрыя.
16.45 Мультфільм.
16.55 «Мэдыкі». Сэрыял.
18.05 «Пакуль гарыць сьвечка».
18.35 «Ледавіковы пэрыяд». Тэлесэрыял.
19.50 «Навіны СНД».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: камэдыя «Лепшыя часы». ЗША, 1986.
23.05 «Рэактыўны бокс».
23.20 Кіно: трылер «Першы мільён».

**● Першы музычны канал**
7.00 «Пад'ёмнік».
8.30 Рухач.
14.00 «V.I.P.онія».
16.00 «20-ка Першых».
17.0. 22.10 УльтраМікс.
22.00 «120/80».
23.00, 0.15 MegaMix.
0.00 «Заваёўнікі кантынэнтаў».

**● АНТ**
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.35 «Нашы навіны».
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.45 Шматсэрыйны фільм «Наступны» («Next-2»).
10.30 Чалавек і закон (з сурдаперакладам).
11.20 «На вастрыі мяча». Прыгодніцкі фільм.
12.45 Сэрыял «Твінісы».
14.50 «Новы дзень». «Таемства звароку».
15.15 «Сем старых і адна дзяўчына». Камэдыя.
16.35 Сэрыял «Ключы ад сьмерці».
17.30 Сьмехапанарама.
18.10 «Вялікае мыцьцё».
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
22.05 «Фабрыка зорак-2». Прэм'ера.
23.50 Гвінэт Пэлтроў у камэдыі «Каханьне злое».
1.10 «Дыброў-party: Дзявочнік».

**● РТР**
8.40 Сэрыял «Кобра. Замарожаны транзыт».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
10.20 «У пошуках прыгод».
17.50 Аншлягі.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Бэнэфіс Ігара Нікалаева.

**● Культура**
15.10 «Фэстываль «Плошча мастацтваў». Музычная праграма.
16.00 «Парыскі часопіс». «Айцец Ігар. Пасьляслоўе да Мэдону».
16.30 «Гербы Расеі».
16.45 125 год з дня нараджэньня Барыса Кустодзіева. «Душа-астраханка». Відэафільм.
17.30 Весткі.
17.40, 23.00 Навіны культуры.
17.55 Паўдзённыя сны.
18.25 «Пакуты». Дак. сэрыял.
18.55 Ток-шоў «Аркестравая яма».
19.35 «Дапамажыце Тэлеку».
19.45 «Мяжа». Мультфільм.
20.05 «Ганна Паўлава». Маст. фільм. 2-я сэрыя.
21.25 «Лінія жыцьця».
22.20 Блеф-клюб.
23.25 «Хто там...».

**● НТВ**
9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
10.00, 11.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
10.05 «Шоў Алены Сьцепаненкі».
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.10 Сэрыял «Бандыцкі Пецярбург».
17.20 Каманда.ru.
18.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
18.35 «Свабода слова» з Савікам Шустэрам.
19.55 Баявік «Жыві і дай памерці іншым».
22.15 Забаўляльная праграма «Усё адразу!».

**● Эўраспорт**
9.30 Снаўборд. Турын. Паўтор.
10.00 Прыгоды на прыродзе. Часопіс. Паўтор.
10.30, 14.30 Лыжныя гонкі. Кубак сьвету. Хальмэнколен. Спрынт. Паўтор.
11.30 Горныя лыжы. Кубак сьвету. Шыкагонэн. Гіганцкі слалам. Мужчыны.
12.30, 18.00 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. 5-ы дзень спаборніцтваў. Паўтор.
15.30 Сумо. Паўтор.
16.30 Фігурнае катаньне. Чэмпіянат сьвету. Юніёры. Чэхія. Спэцагляд. Паўтор.
20.00 Парусны спорт. Новая Зэляндыя. Спэцагляд. Паўтор.
21.00 Лёгкая атлетыка. Лінц.
22.30 Супэркрос. Чэмпіянат сьвету. Індыянапаліс.
23.30 Ралі. Чэмпіянат сьвету. Турцыя. Агляд.
1.15 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

# 8 сакавіка субота

**● БТ**
7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 Музычная казка «Мама».
8.40 «Не зявай!». Праграма для дзяцей.
9.15 «Усё нармальна, мама!».
10.00 Мэлядрама «Ясенія». 1-я сэрыя.
11.25 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.55 «Маршрут №...».
12.15 Вясёлая сямейка.
12.45 Камэдыя «Павадыр» («Беларусьфільм»).
14.25 «Фэстывальныя жарты».
15.15 Кухня КВК.
15.30 Канцэрт Мікалая Баскава «Прысьвячэньне».
17.05 КВК. Кубак выкліку. MAMI (зборная Масквы) — зборная Клюбу КВК Беларусі.
18.35 «Вясна... Жанчына... Каханьне...» Сьвяточнае віншаваньне ад тэлефэстывалю песьні «На скрыжаваньнях Эўропы».
19.20 Авантурная мэлядрама «Сьлёзы пад даждом» (ЗША).
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.30 Прэмія «Оскар». Псыхалягічная драма «Піяніна» (Аўстралія).
23.35 Найлепшыя музыкі сучаснасьці. Група «Іглз» (ЗША).
1.10 Канцэрт Аляксандра Пяскова на «Залатым шлягеры-2001».

**● СТВ**
5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта. Вочы зьмяі». Дак. фільм.
7.20 Фільм-казка «Варвара-краса — доўгая каса».
8.50 «Менск і менчукі».
9.00, 19.05 «СТВ-спорт».
9.10 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.35 «Адпачывай».
9.45 «Арт-праект Яўгеніі Паўлінай».
10.30 Кіно: музычная камэдыя «Формула каханьня».
12.00 «Разам».
12.30 «Плянэта людзей».
12.45 «Філярманічны тыдзень».
12.50 «Рамонт».
13.05 Аляксандра Гайдук у канцэртнай праграме «Гаспадыня балю».
14.05 Кіно: лірычная камэдыя «Заказаны па ўласным жаданьні».
15.35 «Аўтапанарама».
15.55 «Разважаньні пра каханьне». Сьвяточная музычная праграма.
17.20 Кіно: мэлядрама «Вяртаньне ў Блакітную лягуну». ЗША, 1991.
19.05 «Адпачывай».
19.30 «24 гадзіны».
19.50 «Навіны СНД».
20.15 Кіно: камэдыя «Вышэйшая ліга». ЗША, 1989.
22.10 Канцэрт Робі Ўільямза ў Альбэрт-Холе.
23.40 Кіно: мэлядрама «Люсія і сэкс». Гішпанія—Францыя, 2001.

**● Першы музычны канал**
8.00, 12.15 Рухач.
12.00 «Заваёўнікі кантынэнтаў».
17.00 Музыка.RU.
18.00 УльтраМікс.
22.00 Патэфон. Музыка рэтра.
23.00 MegaMix.

**● АНТ**
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Ералаш.
8.25 Камэдыя «Дзяўчына з гітарай».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 Смак.
10.30 Пакуль усе дома.
11.10 Сьмехапанарама.
11.40 Камэдыя «Бляндынка за рогам».
13.10, 14.10 Канцэрт Клары Новікавай.
15.10 «Сярэбраны шар».
15.45 Камэдыя «Каўказкая палоньніца, ці Новыя прыгоды Шурыка».
17.10 «Вялікае мыцьцё». Сьвяточны выпуск.
19.00 «Слабае зьвяно». Спэцыяльны выпуск.
20.00 Час.
20.30 «Нашы навіны».
21.00 «Мільён прыгожых жанчын». Творчы вечар Ігара Нікалаева.
0.50 «Жанчына ў чырвоным». Камэдыя. ЗША.

**● РТР**
8.05 Камэдыя «Лэдзі на дзень».
11.10 Канцэрт Сасо Паўліашвілі «Насіце жанчын на руках».
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 «Гарадок». Дайджэст.
13.55 Футбол Расеі. Супэркубак Прэм'ер-лігі. «Лякаматыў» (Масква) — ЦСКА. Жывая трансьляцыя са стадыёну «Лякаматыў».
16.00 Маст. фільм «Восьмага сакавіка». 2000 г.
17.55, 19.25 Бэнэфіс групы «Экс-ББ».
21.20 Вялікі сьвяточны канцэрт «Усе зоркі для каханай».
23.55 Апошні сэанс. Маст. фільм «Тэсты для сапраўдных мужчын». 1998 г.
1.25 Чэмпіянат сьвету па аўтагонках у клясе «Формула-1». Гран-пры Аўстраліі. Кваліфікацыя. Трансьляцыя з Мэльбурну.

**● Культура**
10.45 Дзіцячы сэанс. «Папялушка». Маст. фільм.
12.00 «Шукайце жанчыну». Алег Табакоў.
12.15 Кінаканцэрт.
12.45 Прэм'ера. С.Маэм. «Верная жонка». Тэлевэрсія спэктаклю Маскоўскага драматычнага тэатру імя М.Гогаля.
15.05 «Я вяртаю Ваш партрэт...». Дак. фільм.
16.05 «Старамодная камэдыя». Маст. фільм.
17.40 «Пакуты». Дак. сэрыял.
18.35 «Сфэры».
19.15 Сьпяваюць вялікія тэнары.
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя». Эдуард VIII і місіс Сымпсан.
21.00 Навіны культуры.
21.20 Прэм'ера. «Шчасьлівыя выпадкі». Маст. фільм.
23.05 «Сага францускага шансону». Эдыт Піяф.

**● НТВ**
9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
9.05 «Кулінарны паядынак».
10.05 «Кватэрнае пытаньне».
11.05 «Гульні на выжываньне». «Прафэсія — рэпарцёр».
11.25 Служба выратаваньня.
12.05 Мэлядрама «Салодкая жанчына».
14.05 Свая гульня.
15.20 Ток-шоў «Прынцып даміно».
17.05 Алена Сьцепаненка. «Здымаецца кіно!». Сьвяточная гумарыстычная праграма.
18.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднbackяковым.
18.30 Камэдыя «Красуня-2, ці Нявеста, якая ўцякла» (ЗША).
20.40 Баявік «Дзеля справядлівасьці» (ЗША).
22.25 Бокс. Рой Джонз супраць Хуліё Ганзалеса.

**● Эўраспорт**
9.30 Горныя лыжы. Кубак сьвету. Шыкагонэн. Слалам. Мужчыны.
10.30, 13.45 Горныя лыжы. Кубак сьвету. Слалам. Жанчыны.
11.15 Лыжныя гонкі. Кубак сьвету. Хальмэнколен. 30 км. Жанчыны. Жывая трансьляцыя.
12.00 Лыжнае дваябор'е. Кубак сьвету. Осла. Скачкі. Жывая трансьляцыя.
14.30 Лыжныя гонкі. Кубак сьвету. Хальмэнколен. 50 км. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
16.00 Лыжнае дваябор'е. Кубак сьвету. Осла. Лыжная гонка. Жывая трансьляцыя.
17.00 Скачкі на лыжах з трампліну. Кубак сьвету. К-115. Осла. Жывая трансьляцыя.
19.00 Лыжныя гонкі. Кубак сьвету. Хальмэнколен. 30 км. Жанчыны. Паўтор.
20.00 Трыял на матацыклах. Чэмпіянат сьвету. Санкт-Пецярбург.
21.00 Тэніс. АТР. Скотсдэйл. Паўфінал. Жывая трансьляцыя.
23.00 Экстрэмальныя віды спорту.
0.15 Экстрэмальныя зімовыя віды спорту.
1.15 Супэркрос. Чэмпіянат сьвету. Індыянапаліс. Паўтор.

# 9 сакавіка нядзеля

**● БТ**
7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.35 Арсэнал. Праграма пра войска.
9.00 Слова мітрапаліта Філарэта на Даравальную нядзелю і пачатак Вялікага посту.
9.15 Алхімія слова.
9.20 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.50 Мэлядрама «Ясенія». 2-я сэрыя.
10.55 Сад мары. Перадача для дачнікаў.
11.20 Наша спадчына. «Клясычныя маёнткі Беларусі».
11.35 «Шляхі Ірыны Дарафеевай». Дак. фільм.
12.15 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Ваша лята».
13.40 «Сьвятло далёкай зоркі. Галіна Макарава».
14.05 «Маршрут №...».
14.10 Вэстэрн «Вуліцы Ларэду» (ЗША).
15.15 «Рынкі сьвету». Дак. сэрыял. Заключная сэрыя.
15.40 Сэрыял «Барацьба за выжываньне».
16.35 Кліп-абойма.
17.15 Музычная камэдыя «Вясна».
19.05 Мэлядрама «Катуй мяне, асыпай пацалункамі» (Італія — Францыя).
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.10 Бокс. Баі наймацнейшых прафэсіяналаў сьвету. Уладзімер Клічко — Коры Сандэрз. Трансьляцыя з Германіі.
23.15 Трылер «Неспакойны сьведка» (Галяндыя).

**● СТВ**
5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта»: «Нашы найлепшыя сябры» з цыклу «Сабачае жыцьцё». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50 «Філярманічны тыдзень».
9.00 «СТВ-спорт».
9.10 «Партрэт у інтэр'еры».
9.25 «Аўтапанарама».
9.45 Сямейнае кіно з калекцыі «Hallmark»: «Дэвід Копэрфілд». 1-я і 2-я сэрыі.
11.30 «Я тут жыву». Дак. фільм.
12.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
12.30 «Добры дзень, доктар!».
12.45 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
13.00 Кіно: маст. фільм «Вам і ня сьнілася». СССР, 1980.
14.35 «Відавочца».
15.10 «Чыста па жыцьці». Сэрыял.
15.45 Мультфільм.
16.00 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
16.25 «Вуншпунш». Мультсэрыял.
17.00 «Залатая дзясятка беларускай опэры».
17.30 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
18.20 «168 гадзін».
19.05 «Усё для цябе».
19.35 «Пакуль гарыць сьвечка».
20.10 Кіно: псыхалягічная драма «Містэр Джонз». ЗША, 1993.
22.05 «Гульнявы рэфлекс».
22.15 «Навіны СНД».
22.30 «А я песьню сваю дапяю...». Дак. фільм цыклу «Агульны дом».
22.45 Кіно: фільм «Сапраўдная гісторыі». ЗША, 1986.

**● Першы музычны канал**
8.00, 12.45 Рухач.
12.00 «Пра Fashion». Модная праграма.
17.00 Музыка.RU.
18.00 УльтраМікс.
22.00 Патэфон. Музыка рэтра.
23.00 MegaMix.

**● АНТ**
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Жарт за жартам».
10.40 «Падарожжы натураліста».
11.10 Прыгодніцкі фільм «Амазонія».
12.50 «Арцём». Дак. фільм.
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.10 «Работа, якая называецца сачыненьнем». Дак. фільм цыклу «Наш агульны дом».
14.25 «Сярэбраны шар».
15.05 Ток-шоў «Выбар».
15.50 Мэлядрама «Прынцэса на бабах».
17.55 «Я цябе па-ранейшаму кахаю». Канцэрт Сафіі Ратару.
19.25 «Хто хоча стаць мільянэрам?». Спэцыяльны выпуск.
20.30 «Контуры».
21.10 «Апошні герой-3».
22.15 Камэдыя «Джуніёр».
0.15 Баявік «Вялікая бойка ў Бэтэл Крык».

**● РТР**
8.50 Ранішняя пошта.
9.25 «Сто да аднаго». Тэлегульня.
10.15 Сам сабе рэжысэр.
11.15 У пошуках прыгод.
12.10 Клюб сэнатараў.
13.00 Весткі.
13.20 Камэдыя «Тры плюс два».
15.05 Мая сям'я.
16.05 Аншлягі.
17.00 Камэдыя «Ўтаймаваньне наравістага» (Італія). 1980 г.
18.50 У «Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
19.55 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.20 «Сьвяточнае шоў Валянціна Юдашкіна».

**● Культура**
11.15 Дзіцячы сэанс. «Васіліса Прыгожая». Маст. фільм.
12.25 Вуглы манежу.
12.55 «Сьмсала Грым. Чорт і тры залатыя валаскі». Мультфільм.
13.25 «Там пабылі». Дак. сэрыял.
13.55 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
14.50 «Час музыкі». Тэлечасопіс.
15.20 Шэдэўры сусьветнага музычнага тэатру. Дж.Пучыні. «Тоска». Фільм-опэра.
17.40 «Пакуты». Дак. сэрыял.
18.30 «Гамаза».
19.00 «Абсалютны нягоднік». Тэлесэрыял. 1-я сэрыя.
19.50 Зорныя гады «Ленфільму».
20.30 «Болей чым каханьне». «Слова пра забытае каханьне».
21.10 «Замкі жахаў». Дак. сэрыял.
21.35 «Культ кіно». «Фрэкен Юлія». Маст. фільм.
23.25 «Джазафрэнія».

**● НТВ**
9.00, 10.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00 Сёньня.
9.05 Сьвяточны канцэрт «Песьні для каханых і адзіных».
10.25 «Расьліннае жыцьцё».
11.05 Праграма «Уплыў».
12.05 Камэдыя «Сямейства. Блюз пад прыкрыцьцём» (ЗША).
13.45 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.05 Маст. фільм «Замест мяне».
18.00 «Сёньня».
18.30 Прэм'ера. Камэдыя «Танга ўтраіх» (ЗША).
20.30 Блякбастэр «Блакітны гром» (ЗША).
22.35 Прэм'ера. Трылер «Нямы сьведка».

**● Эўраспорт**
9.30, 13.45, 19.30, 0.45 Скачкі на лыжах з трампліну. Кубак сьвету. К-115. Осла. Паўтор.
11.00 Лыжнае дваябор'е. Кубак сьвету. Осла. К-115. Жывая трансьляцыя.
12.00 Лыжныя гонкі. Кубак сьвету. Хальмэнколен. 50 км. Мужчыны. Паўтор.
13.15 Лыжнае дваябор'е. Кубак сьвету. Осла. Жывая трансьляцыя.
14.30 Скачкі на лыжах з трампліну. Кубак сьвету. К-115. Осла. Жывая трансьляцыя.
16.30 Вэласпорт. Парыж—Ніцца. Пралёг. Жывая трансьляцыя.
18.00 Тэніс. АТР. Скотсдэйл. Паўфінал.
21.00 Аўтагонкі сэрыі Інды. Хоўмстэд.
22.00 Аўтагонкі сэрыі Наскар. Ласвэгас.
23.00 Тэніс. АТР. Скотсдэйл. Фінал. Жывая трансьляцыя.

# «ЧП» у «Беларускай хатцы»

**11** сакавіка ў «Беларускай хатцы» (вул.Рабкораўская, 19, мэтро «Інстытут культуры») адбудзецца прэзэнтацыя кнігі Зьмітра Бартосіка «Чорны пісталет».

Будуць таксама Ўладзімер Арлоў і Адам Глёбус. Пачатак а 18-й. Уваход вольны.




АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# 40 гадоў да дня перамогі

**Загаварылі пра чарговае «згубленае пакаленьне», пра сёньняшніх саракагадовых «маладых людзей», якія і ня маюць яркіх лідэраў, і выпалі з палітычнага жыцьця, і ня могуць весьці за сабой народ, і ўвогуле — «праспалі» такую краіну! Мяне, як аднаго з гэтых «недарэкаў», такія закіды прымушаюць задумацца: што мог, але не зрабіў я і мае раўналеткі?**

Мы выхоўваліся ў часы позьняга застою, калі савецкая «гордасьць», хоць і паточаная дысыдэнцкім рухам ды зьедлівым скепсісам замежных радыёгаласоў, яшчэ здавалася вечнай, як сонца. Перабудова нарадзіла ў нас энтузіязм першаадкрывальнікаў новага сьвету і рамантычныя чаканьні хуткага шчасьця. Імклівасьць, зь якой зьнік Савецкі Саюз, спарадзіла ілюзію лёгкага разбурэньня і ягонай спадчыны. Мы апынуліся між дзьвюх эпох — савецкай і новаэўрапейскай. Для нас па-ранейшаму застаюцца цікавымі Сталін і Гарбачоў, хрушчоўская «адліга» і брэжнеўскія «заціскі», але нашы наступнікі глядзяць зусім у іншы бок ды жывуць абсалютна іншымі інтарэсамі й занятками.

Я часта лаўлю сябе на тым, што пастаянна спрабую перамагчы ў сабе «саўка». Гэты занятак будзе маім спадарожнікам да самага скону. Максімалісты-рэвалюцыянэры тут угледзяць пасіўнасьць і нават здраду ідэалам «рамантычнага» адраджэньня. А было ж усё: і пікеты, і шэсьці, і мітынгі, і збор подпісаў, і начныя распаўсюды нагляднай агітацыі... На жаль, краіна абрала эвалюцыйна-кансэрватыўны шлях у будычыню, які патрабуе найперш унутранай працы, вялікіх інтэлектуальных і духоўных намаганьняў. Ня ўсе сёньняшнія адраджэнцы захавалі імпэт дзесяцігадовай даўніны. Многія сышлі ва ўнутраную эміграцыю, у вузкапрафэсійнае ці сямейнае кола, дзе часам ня маюць з кім перакінуцца родным словам.

Іх можна зразумець, бо звычайна гэта сарамлівыя сьціплыя інтэлігенты, для якіх публічнасьць і самапаказ ёсьць значнай праблемай. Да таго ж, у мястэчку ці невялікім горадзе без трывалага беларускага асяродку ўсё жыцьцё праходзіць як на далоні, лёгка ўзьнікаюць канфлікты з уладамі, «органамі» ці проста лукашыстамі. Асуджаць людзей за «здраду» ў такіх умовах лёгка толькі тым, хто сам ня быў у іхняй скуры. Для гэтага часу ёсьць свая тактыка і стратэгія, і адна з найбольш эфэктыўных — праца ў трэцім сэктары і падтрымка прыватных грамадзянскіх ініцыятыў.

Час цяпер нялёгкі, роспач апанавала многіх. Маюць рацыю і Лявон Вольскі, і Славамір Адамовіч: на беларускай дзялянцы не здабыць ні амэрыканскіх грошай, ні расейскай славы. Але ж і палякі йшлі да сваёй перамогі сорак гадоў. Было на тым шляху паразаў ня менш, чым у нас.

Глыбокае расчараваньне ды разлад перажываюць і нашы апанэнты, і «электарат», і значная частка моладзі. Менавіта ў такім стане людзі становяцца ўспрымальнымі да новых ідэй і могуць зразумець тое, да чаго былі глухія дзесяць гадоў назад. Будучыня за тымі, хто лепш давядзе ім свае думкі і пэрспэктывы, хто стане найлепшым аптымістам у часы грамадзкага пэсымізму.

**Васіль Аўраменка, Магілёў**

# Подых навальніцы

Працяг са старонкі 2.

Посьпехі, пераважна адзінкавыя, ёсьць у Койданаве, Вузьдзе, Жлобіне, Мазыры, Пінску, Берасьці, Глыбокім, Віцебску, Сьветлагорску, Буда-Кашалёве, Асіпавічах, Дрыбіне. Горшыя, чым чакалася, вынікі ў Лідзе, Слоніме, Маладэчне, Ваўкавыску, Навагрудку, Баранавічах. Улады там былі ўдвая пільнымі, дый нацыянальнаму руху ў гэтых заходнебеларускіх гарадах не хапіла адзінства і новых ідэяў.

### Што будзе ў 2004-м

«Гэтая кампанія ў частцы падліку галасоў і абвяшчэньня вынікаў выбараў была на некалькі ступеняў больш брудная, чым нават выбары ў палату прадстаўнікоў і прэзыдэнцкія выбары. Я на свае вочы бачыў, як бюлетэні аднаго кандыдата перакладаліся на карысьць другога кандыдата!..» — абурэецца ў інтэрвію радыё «Свабода» актывіст АГП Яўген Лабановіч.

Дэмакратаў у будучыні чакае тактыка, абкатаная ў сталіцы. Частку небясьпечных кандыдатаў не рэгіструюць. Іншую здымаюць за парушэньні напярэдадні выбараў. Магчымасьці агітацыі зводзяцца да нуля. «Нябачныя» для назіральнікаў скрынкі датэрміновага галасаваньня страхуюць асабліва непапулярных.

Адсекшы ад саветаў усіх партыйных лідэраў, улады дасягнулі небясьпечнага эфэкту. Нават памяркоўная частка апазыцыі зразумела, што зможа разьлічваць на перамогу толькі пры магутнай падтрымцы «вуліцы» і наяўнасьці шматлікіх назіральнікаў. Тым самым апазыцыю зноў паставілі перад неабходнасьцю рыхтаваць «югаслаўскі варыянт».

**Барыс Тумар**

ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

# Мой Аляхновіч

**Адбылося гэта ў далёкім 1941-м. Шэрым восеньскім надвячоркам з Слуцку прыехаў бацькаў знаёмы й прывёз сьвежы нумар «Менскай газэты». Пасьля прыходу немцаў на Случчыну газэт у вёсцы ніхто ня бачыў і людзі нічога ня ведалі пра фронт — нават дзе ён знаходзіцца.**

Маю ўвагу прыцягнуў вялікі артыкул «У капцюрох ГПУ». Над загалоўкам значылася прозьвішча аўтара — Францішак Аляхновіч. Тое, пра што аўтар пісаў, мяне зацікавіла. Бацьку — тым болей. Вярнуўшыся ў хату, ён успомніў тое, пра што ні сам, ні маці не гаварылі пры дзецях дзесяць гадоў. У 1931 г. бацьку выклікалі ў Старобінскае ГПУ і пратрымалі ў вязьніцы аж два тыдні: нехта данёс, што ён мае царскія залатыя манэты. Тады якраз бальшавікі «выбівалі» грошы на «будоўлі камунізму». Бацьку сказалі, каб здаў золата, інакш дамоў не адпусьцяць. А ён заўпарціўся. Дык яго пяць разоў адпраўлялі «падумаць» у засланы гнілой саломай хляўчук, які выкарыстоўваўся як вязьніца. Людзям, што трапілі туды, давалі на дзень па кавалку чэрствага хлеба, гнілога селядца і кубку вады. Уламаць бацьку гэпэушнікі ня здолелі — адпусьцілі дамоў, узяўшы падпіску, што будзе маўчаць.

Чутка пра незвычайную газэту хутка разышлася па вёсцы. Да нас у хату сталі прыходзіць ахвотныя пачытаць артыкул пра ГПУ. Людзі спадзяваліся, што Аляхновіч згадае прозьвішчы іх высланых на поўнач сваякоў. Такіх было аж шэсьць сем'яў.

Адным зь першых прыйшоў пачытаць газэту бацькаў швагер Алесь Кунцэвіч — ягонага бацьку Петруся забраў «чорны воран». А дзядзьку Костуся, роднага брата бацькі, выслалі з жонкай і траімі малымі дзецьмі як «нядобранадзейных» разам зь сям'ёй Ёсіпа Жаўрыда. Ягоная пятнаццацігадовая дачка Шура, што ўцякла праз год з-пад Котласу, таксама прыходзіла на «чытанкі», успамінала пра жыцьцё высяленцаў-кулакоў у тайзе, у вашывых бараках, у голадзе і холадзе ды пра свае пакутлівыя ўцёкі зь няволі.

Акрамя «Капцюроў ГПУ» мяне зацікавіў газэтны артыкул «Арміі Цімашэнкі пераможаны», дзе гаварылася аб разгроме атачаных каля Вязьмы шасьці арміяў савецтаў і ўзятых там 637000 палонных. Людзі казалі, што немцы перабольшваюць страты бальшавікоў. Але пасьля таго як у Слуцак прыгналі 15000 чырвонаармейцаў, палоненых пад Вязьмай, сумнеў вяскоўцаў разьвеяўся.

У другі раз апавесьць Ф.Аляхновіча я перачытаў ужо ў гады перабудовы, калі яна выйшла асобнай кніжкай. Чытаў і прыпамінаў той шэры кастрычніцкі надвячорак 41-га, калі ўпершыню пазнаёміўся з «капцюрамі ГПУ». Іх ахвярамі толькі ў маёй вёсачцы на 26 двароў стала дзевяць сем'яў — 28 чалавек. Вярнуліся назад пасьля сьмерці Сталіна толькі 11 чалавек. Дажывалі свой гаротны век у сваякоў ці прыстасаваных для жытла закінутых калгасных сушнях ды хлявах, бо хаты раскулачаных яшчэ ў 30-м вывезьлі ў суседнія вёскі.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА АПАЗЫЦЫІ

# Дык ці ўсё нармальна?

**Кіраўнікі БНФ Вінцук Вячорка і Галіна Сямдзянава 25 лютага сустрэліся з сваімі гарадзенскімі паплечнікамі. Сп.Вінцук пераконваў слухачоў, што «ўсё ідзе нармальна».** У партыю штодня запісваюцца новыя сябры. Асабліва ў менскай штаб-кватэры. На жаль, у гарадзенскай залі новых абліччаў не назіралася. Усё тыя ж, даўно знаёмыя... Дый гэтых з кожным разам менш.

Пакуль госьці выкладалі свае думкі, прысутныя занатоўвалі прозьвішчы і адрасы на паперы, пушчанай кімсьці па залі. Было ўражаньне, што праведзены чарговы сэмінар і трэба здабыць подпісы людзей для справаздачы... Я не падпісаўся.

**Антон Лабовіч, Горадня**

# Марш 12 сакавіка

Працяг са старонкі 1.

19 лютага з арганізатарамі салідарызавалася Менская абласная асацыяцыя шматдзетных бацькоў. 20-га — нямецкія праваабаронцы, 21 лютага — мастак Аляксей Марачкін, 24 лютага — заслужаны дзяяч мастацтваў Уладзімер Пузыня. 25 лютага ў склад аргкамітэту маршу ўвайшоў прафэсар Юры Хадыка і, такім чынам, да Маршу далучылася Партыя БНФ. 26-га з заявай падтрымкі выступіў Генадзь Бураўкін, за ім сьледам — дэпутацкая група «Рэспубліка».

Гучаць і галасы «супраць». Іх падсумавалі ў сваёй супольнай заяве грамадзкія лідэры Горадні. «Спроба правесьці дзьве акцыі ў адзін месяц выкліча нэгатыўныя наступствы. Праз падзеленасьць рэсурсаў ніводная з акцый ня будзе дастаткова масавай, каб істотна паўплываць на хаду палітычных падзей», — мяркуюць яны. На іх думку, правядзеньне шэсьця 12 сакавіка пад сацыяльна-эканамічнымі лёзунгамі, а 25 сакавіка — пад лёзунгамі незалежнасьці й дэмакратыі створыць у часткі насельніцтва ўражаньне, што незалежніцкія лёзунгі й патрабаваньне годнага жыцьця — не зьвязаныя між сабой рэчы. Гарадзенцы заклікаюць да кампрамісу — адзінай акцыі 25 сакавіка, але пад сацыяльнымі лёзунгамі.

Каардынатар «Хартыі» Зьміцер Бандарэнка ня згодны. «Аргкамітэт «Народнага маршу» будзе браць актыўны ўдзел у сьвяткаваньні 25 Сакавіка, — заяўляе ён. — Агульная праграма на гэтыя акцыі распрацаваная, яна рэалізуецца. Лёзунг «Жыве Беларусь!» будзе гучаць 12 сакавіка ў Менску і 25 сакавіка па ўсёй краіне». Махавік падрыхтоўкі Маршу раскручаны, і арганізатары разьлічваюць на маштабны вынік. Заяўка на Марш пададзеная. Пачацца ён мусіць а 18-й з плошчы Якуба Коласа. Адказ гарвыканкаму пакуль невядомы.

**Мікола Бугай; АТ**

АСЯРОДЗЬДЗЕ

# На пацеху Жырыноўскаму

**Калі меркаваць па колькасьці помнікаў, дык другім пасьля Леніна гамяльчане шануюць Чайкоўскага. Бываць тут кампазытару не давялося, аднак помнікаў яму ў Гомелі ажно два.** Другі паставілі нядаўна, да прыезду дэпутатаў расейскай Думы, — няхай Жырыноўскі зь Зюганавым пацешацца! Ніколі ня быў у Гомелі й Мікалай Астроўскі, помнік якому стаяў спачатку ў глыбіні прыватнай забудовы. Але наведвалі яго там адно сабакі ды куры, таму ўлады перанесьлі статую да раённага аддзелу міліцыі.

Пушкін заслужыў ад гамяльчанаў толькі бюст. Затое (які гонар для нас!) Сяргеевіч неяк праяжджаў праз Гомель на шляху з Адэсы ў Міхайлаўскае. А вось беларускія празаікі, паэты, драматургі, якія нарадзіліся ў Гомелі, працавалі тут і памерлі ў гомельскай турме, не заслужылі ад нашчадкаў нават мэмарыяльных дошак.

Паміж вуліцамі Маскоўскай і Кіеўскай уражвае сваімі памерамі помнік Хмяльніцкаму. Паўтара месяца казакі заваёўвалі Гомель, а потым спалілі яго. У параўнаньні з Хмяльніцкім маленечкі помнік Дзяржынскаму, што стаіць ля будынку КДБ, выглядае зусім бяскрыўдна. А хіба Фэлікс менш за Багдана загубіў нашых продкаў? Не забыліся гамяльчане й на Кірава з Калініным.

А ці ёсьць у нас помнікі беларусам? Ёсьць. Бюсты военачальніка Галавачова, авіяканструктара Сухога (перад помнікам — фантан) і савецкага дзеяча Грамыкі. Праўда, Беларусь для іх — толькі «малая радзіма».

Тандэтныя гіпсавыя помнікі пакрысе разбураюцца, таму іх пацюху прыбіраюць. У жніўні 91-га страціў галаву помнік Леніну ля ўнівэрсытэту, тырчыць пусты пастамэнт у сквэрыку Астроўскага, зьніклі бюсты Леніна й Маркса, што стаялі ля чыгуначнага тэхнікуму.

Зьяўляюцца й новыя помнікі. У глыбіні парку мінакоў пужае бюст расейскага канцлера Мікалая Румянцава. Ягоны бацька падчас паўстаньня Касьцюшкі камандаваў расейскімі войскамі ў Рэчы Паспалітай. Сам Мікалай праславіўся тым, што вывез у Пецярбург мноства беларускіх кніг, рукапісаў, дакумэнтаў. Да 8 сакавіка ў цэнтры гораду паставяць помнік апошняй уладальніцы Гомелю Ірыне Паскевіч, унучцы Івана Паскевіча, які камандаваў задушэньнем паўстаньня 1830—31 г. А ў сквэрыку ля кінатэатру «Кастрычнік» неўзабаве зьявіцца помнік Шаўчэнку.

**Сяргей Баранаў, Гомель**

ЗЬ НЯМЕЧЧЫНЫ

# Беларускае ў Вэцляры

**Адукаваны чалавек, калі чуе пра нямецкі горад Вэцляр, адразу згадвае пра маладога Гётэ і яго каханку Шарлоту.** Але мала хто ведае, што ў гэтым мястэчку знаходзіцца й найбагацейшая скарбніца неклясычнае літаратуры. Недалёка ад Старога гораду, на Шылерпляц, пад шатамі дрэў схаваўся тыповы нямецкі дамок зь пясчанай цэглы. Яго незвычайнасьць выдае зялёны цмок на фасадзе і шыльда «Phantastische Bibliothek».

Тут сабрана больш за 120 тыс. тамоў казак, дэтэктываў, філязофскіх трактатаў, сагаў, раманаў пра каханьне, коміксаў. Але да сёньняшняга дня было б дарэмна шукаць, нават сярод 80-томнага выданьня сусьветнага фальклёру, беларускія казкі. Армянскія, казахскія, кіпрскія — калі ласка. Але матуліных, пяшчотных, знаёмых зь дзяцінства — са сьвечкай не знайшоў бы! Засталіся б мы без увагі, калі б адзін наш суайчыньнік не падараваў бібліятэцы больш за 30 кніг. Акрамя народных паданьняў фантастычная літаратура беларусаў прадстаўленая гістарычнай прозай Вольгі Іпатавай, Алеся Петрашкевіча, Кастуся Тарасава, бэлетрыстыкай Франца Сіўка, дасьледаваньнямі Лявона Юрэвіча. Знайшлося гнязьдзечка і маўраўскай Райскай птушцы, і лынькоўскага Міколку-паравоза не пакінулі на запасных рэйках.

**Арцём Арашонак, Вэцляр**

# Адкуль пайшла вайна

**Адкуль у чалавеку схільнасьць да гвалту? Унівэрсальнай прычынай чалавечае агрэсіі зьяўляецца старадаўні прынцып «Вока за вока, зуб за зуб», — у адзін голас цьвердзяць дасьледнікі міжплямённых войнаў.**

«Хоць сёньня ў людзей ёсьць ядравая зброя, іх думкі й эмоцыі ня надта адрозьніваюцца ад думак і эмоцыяў дзікуноў з каменнымі сякерамі», — кажа Пол Раско, дасьледнік з Мэнскага ўнівэрсытэту. Плямёны Новай Гвінэі, якія ён вывучаў, амаль увесь час знаходзіліся ў стане канфлікту. Часта вайна цягнулася дзясяткі гадоў. Галоўным матывам была помста, што супярэчыць тэзе пра стрыманьне агрэсіі шляхам зьвядзеньня рахункаў. На думку Раско, помста за сьмерць сваякоў уласьцівая толькі чалавеку. Чалавек — адзіная істота, што забівае ворага за мінулыя крыўды.

Прычыны гэтага — у нашым мозгу. За інтэлект і творчыя здольнасьці адказвае яго частка, названая карой. Яна ж абумоўлівае нашае пазытыўнае й нэгатыўнае стаўленьне да іншых людзей. Таксама ад яе залежаць нашыя эмоцыі й магчымасьць моўнай камунікацыі.

Каб «ашукаць» натуральнае нежаданьне забіваць падобных да сябе, новагвінэйскія плямёны трактуюць вайну як гульню й намагаюцца пераканаць сябе, што змагаюцца не зь людзьмі. Дэгуманізацыя праціўнікаў праз параўнаньне іх з сабакамі нярэдка выкарыстоўваецца нават «цывілізаванымі» палітычнымі лідэрамі. Дый вынаходзтва зброі, што забівае на адлеглласьці, безь непасрэднага кантакту твар у твар, дапамагае ашукваць сьвядомасьць.

Ці даўно чалавецтва ваюе? Адны дасьледнікі кажуць, што прыблізна 10 тыс. гадоў, другія — што значна даўжэй. Лорэнс Кілі, прафэсар антрапалёгіі Ілінойскага ўнівэрсытэту, цьвердзіць, што гісторыя нацыянальных дзяржаваў ня ведае такіх войнаў, якія былі ў пляменных соцыюмах. Паводле яго словаў, вайна як зьява інтэнсыфікуецца там у цяжкія часы (асабліва эканамічна цяжкія). Аднак нагодай для яе могуць стаць міжкультурныя межы, на якіх зазвычай адбываецца найбольш гвалту. Таму прысутнасьць адной-адзінай ваяўнічай групы выклікае канфлікты ва ўсім рэгіёне.

На думку П.Раско, за апошнія 10 тыс. гадоў людзі ператварыліся з паляўнічых і жывёлаводаў у паляўнічых і жывёлаводаў з тэрмаядравай зброяй. Нашыя сацыяльныя й палітычныя сыстэмы зьмяняюцца значна павольней за сучасныя тэхналёгіі. Таму, кажа Раско, застаецца спадзявацца, што разуменьне мэханізмаў вайны дазволіць нам спыніць узаемнае забойства яшчэ да таго, як чалавецтва зьнікне з паверхні Зямлі.

**МХ; «Gazeta Wyborcza»**



**Так выглядала «Бура ў пустыні» 10 тыс. гадоў таму**

# Што дапаможа нам? Толькі вадарод!

**Савецкі міністар абароны атрымлівае ад свайго аналітыка даклад, паводле якога нафтавыя рэсурсы праз 30 гадоў вычарпаюцца. Савецкая звышдзяржава будзе вымушаная ці купляць нафту на сусьветным рынку (а гэта — залежнасьць ад варожага замежжа), ці шукаць велізарныя сродкі для пераводу прамысловасьці на газ. І міністар загадвае рыхтавацца да захопу багатага на нафту Ірану.**

Праз колькі дзён амэрыканскі мільярдэр, што нажываецца на вырабе зброі, чытае падобны даклад свайго аналітыка — толькі пра ЗША. Ён загадвае зьнішчыць каралеўскую сям'ю Саудаўскай Арабіі, каб суседзі самі папрасілі Злучаныя Штаты ўзяць гэтую багатую нафтай краіну пад вайсковы кантроль. Так пачынаецца раман Фрэдэрыка Фарсайта «Перамоўшчык», напісаны ў 1989 г. У 2002 г. навукоўцы сапраўды абвясьцілі, што да моманту, калі патрэба ў нафце і нафтапрадуктах пераўзыдзе магчымасьці яе здабычы й перапрацоўкі, засталося 15 гадоў.

Пасьля бэнзын зробіцца дарагім і дэфіцытным. Адмысловцы ва ўсім сьвеце зьвяртаюць поўныя надзеі позіркі ў бок вадароднага паліва. А Ісьляндыя, краіна-востраў на самай поўначы Эўропы, вось ужо некалькі дзесяцігодзьдзяў пасьпяхова распрацоўвае тэхналёгіі выкарыстаньня вадароду.

Сёлета ў Рэйк'явіку зьявяцца тры гарадзкія аўтобусы, што будуць сілкавацца ад паліўных элемэнтаў. Паліўны элемэнт — гэта электрахімічнае прыстасаваньне, якое выпрацоўвае электрычнасьць шляхам хімічных рэакцыяў. Большасьць паліўных элемэнтаў працуюць на вадародзе, і адзіным іх «адкідам вытворчасьці» становіцца вада. Экспэрымэнтальныя легкавікі й аўтобусы, якія сілкуюцца ад паліўных элемэнтаў, не забруджваюць навакольнага асяродзьдзя ды ходзяць даўжэй і цішэй за сваіх калегаў з рухавікамі ўнутранага спальваньня.

Вадарод у прыродзе зьвязаны зь іншымі элемэнтамі. Каб атрымаць яго ў чыстым выглядзе, выкарыстоўваецца электрычнасьць. Але цяпер дзеля атрыманьня электрычнасьці шырока ўжываюцца тыя ж нафта ды газ. Трэба замяніць іх якімісьці «чыстымі» крыніцамі. У Беларусі першыя спробы атрымаць вадарод і кісларод з вады зрабіў акадэмік Андрэй Красін у пачатку 1970-х. Тады здабываць вадарод зьбіраліся з дапамогаю вялікіх тэмпэратураў. Пабудаваны беларускімі навукоўцамі лятась выпрабавальны генэратар вадароду сынтэзуе яго з прыроднага газу шляхам хімічных рэакцыяў. Пабудову рэактара прафінансавала французская кампанія «L'Air Liquide», вядомая ў сьвеце вытворца розных газаў для прамысловых і мэдычных патрэбаў. Генэратар некалькі месяцаў пасьпяхова працаваў на адной з газакампрэсарных станцыяў «Белтрансгазу» пад Менскам.

А сёлета Інстытут цепла- і масаабмену імя А.Лыкава НАН мусіць пачаць рэалізацыю адмысловае праграмы фундамэнтальных дасьледаваньняў, якая атрымала назву «Вадародная энэргетыка». Фінансавацца яна будзе зь дзяржаўнага бюджэту, з сродкаў зацікаўленых ведамстваў ды ўласных сродкаў удзельнікаў праграмы і спажыўцоў атрыманае прадукцыі.

Плянуецца запрасіць да ўдзелу ў распрацоўцы «Вадароднае энэргетыкі» кваліфікаваных навуковых, інжынэрных і тэхнічных кадры Акадэміі навук, Мінадукацыі, Мінпрамысловасьці ды іншых ведамстваў і арганізацыяў. Выкананьне праграмы разьлічанае на 2-3 гады. Адна з асноўных выніковых мэтаў — «узмацненьне энэргетычнай бясьпекі дзяржавы». Падлічана: калі беларусы ў якасьці паліва будуць выкарыстоўваць вадарод, залежнасьць ад паставак расейскага прыроднага газу зьменшыцца ўдвая.

**Міхал Чарвінскі**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Яшчэ ў 1978 г. Брагі Арнасон, прафэсар хіміі з Ісьляндзкага ўнівэрсытэту ў Рэйк'явіку, прапанаваў да 2030—40-х стварыць шчасьлівае «вадароднае грамадзтва», што не выкарыстоўвае вуглевадароднага паліва, на адной асобна ўзятай высьпе. А сёлета ў Інстытуце цепла- і масаабмену імя А.Лыкава НАН навукоўцы працуюць над «Вадароднай энэргетыкай»**

# У пошуках новай Зямлі

Ці можа ў знойдзеных на гэты час зоркавых сыстэмах хаваецца плянэта, падобная да Зямлі? Так, хоць шанцаў няшмат — сьцьвярджаюць аўтары артыкулу, што зьявіўся ў «Astrophysical Journal».

Другой Зямлі ў космасе пакуль не знайшлі. Усе плянэты, што круцяцца вакол зорак кшталту Сонца, нагадваюць наш Юпітэр. Але нашае абсталяваньне дазваляе бачыць толькі аб'екты значнага памеру — вялікія газавыя шары. Калі зірнуць у тэлескоп на Сонечную сыстэму, апроч Юпітэру таксама нічога відаць ня будзе. Іншыя плянэты, нават такія вялікія, як Сатурн і Ўран, цяжка заўважыць.

Ці могуць побач з тымі газавымі гігантамі вандраваць па арбітах меншыя? Гэта высьвятляюць Крыстэн Мэну й Сэрж Табачнік з Прынстанскага ўнівэрсытэту (ЗША).

Іх зацікавілі скалістыя шары, якія круцяцца вакол зоркі ў г.зв. зоне жыцьця — на адлегласьці, якая дазваляе захоўваць на паверхні ваду. Там не павінна быць ні надта горача (бо вада выпарыцца), ні надта халодна (бо яна ператворыцца ў камень). У Сонечнай сыстэме толькі нашая плянэта знаходзіцца ў гэтай зоне. Вэнэра заблізка да Сонца, а Марс задалёка. Таксама плянэта мусіць быць ня дужа маленькай, бо інакш не ўтрымае каля сябе дастаткова густой атмасфэры. І ня вельмі вялікай (ня большай за дзесяць Землях), бо тады можа ператварыцца ў газавы шар.

Мэну й Табачнік спрабавалі шукаць такія плянэты ва ўжо адкрытых сыстэмах. Але выявілася, што ў палове гэтых сыстэмаў «юпітэры», у адрозьненьне ад нашага, круцяцца па эліптычных арбітах, абабягаючы з часам усю плянэтную сыстэму. Кампутарныя імітацыі паказалі, што такі важкі спадар выкіне сваіх меншых сябровў за межы «зоны жыцьця», а мо і за межы сыстэмы наагул.

У іншых плянэтных сыстэмах «юпітэры» занадта гарачыя і круцяцца побач з «сонцам». Згодна з сучаснымі тэорыямі эвалюцыі, яны нарадзіліся далёка ад «сонца», а пасьля па сьпіралі наблізіліся да яго, расьпіхваючы па дарозе плянэты кшталту Зямлі. Ёсьць, вядома, варыянт, што «зямля» здолее нарадзіцца пасьля таго, як «юпітэр» наблізіцца да зоркі. Але гэта таксама ня дужа аптымістычная пэрспэктыва. Бо наш волат Юпітэр прыцягвае да сябе камэты й плянэтоіды, што накіроўваюцца ў цэнтар сыстэмы. Такім чынам, ён, як шчыт, ахоўвае Зямлю ад касьмічнага бамбардаваньня. «Юпітэры», якія самі знаходзяцца ў цэнтры сыстэмы, такіх функцыяў не выконваюць.

Мэну й Табачнік вылічылі ўсяго некалькі плянэтных сыстэмаў, якія маглі б утрымліваць «землі»: Gl 777A, HD 4208, HD 72659, 47UMa, HD 13507.

«Але ня трэба быць пэсымістамі», — кажа прафэсар Багдан Пачынскі з таго ж Прынстанскага ўнівэрсытэту. Ён з асьцярогай ставіцца да прагнозаў, зробленых на падставе толькі тэарэтычных развагаў, і лічыць, што трэба чакаць зьяўленьня тэхнікі, якая дазволіць нам бачыць меншыя плянэты.

**МХ; «Gazeta Wyborcza»**

# Сола для Скрыпкі

**«Воплі Відаплясава» апошні раз былі ў Менску пару гадоў таму з прэзэнтацыяй альбому «Хвилі Амура». І вось пайшлі чуткі, што ў апошні дзень зімы «ВВ» прывязуць да нас сваю новую праграму «Файно!». Менавіта чуткі, бо з рэклямы быў хіба адзін плякат між станцыямі мэтро «Купалаўская» і «Кастрычніцкая». Але карыстальнікаў эскалятара выявілася малавата, каб запоўніць КЗ «Менск». Нават пасьля трэцяга званка партэр шчэрыўся пустымі крэсламі, у якія паступова перацякала публіка з балконаў. Ёсьць падазрэньне, што частку патэнцыйных слухачоў прывабіў таньнейшы і раднейшы «Народны альбом».**


VOPLI.COM

Ад пачатку насьцярожыла беднасьць інструмэнтальнае базы «ВВ». За колькі хвілінаў да канцэрту на сцэне стаялі толькі крэсла, гітара, баян, труба, мікрафоны. І ўсё. Тыя, хто ведае, колькі часу трэба, каб скласьці й падгучыць бубны, унутрана насьцярожыліся. І недарэмна: на сцэну выйшаў адзін Алег Скрыпка. Астатнія відаплясаўцы «загрыпавалі» й засталіся ў Кіеве.

І франтмэн «ВВ» адпрацаваў за чатырох. Сьпяваў, дэклямаваў, адказваў на пытаньні, нават паказваў кіно. Сьпярша гаварыў па-расейску, пасьля беззваротна зьбіўся на ўкраінскую. Граў на баяне і трубе адначасова. Пад яго нагу, якой ён адбіваў сабе такт, урэшце паставілі спэцыяльны мікрафон. Я ўпершыню бачыў, як адзін чалавек з электрагітарай ставіць залю на вушы.

Алег ахутаў усіх сваёй утульнай сьветлай харызмай і хуценька «ўтік» на цягнік. Але карэспандэнт «НН» пасьпеў пагутарыць зь ім.

**«НН»: Як Вам падабаецца менская публіка і Беларусь?**

**Алег Скрыпка:** Паездкі ў Беларусь асацыююцца ў мяне з навуковай фантастыкай. Гэта нейкі сюжэт пра расшчапленьне рэальнасьці ці пра паралельныя сусьветы. Я пачынаю разумець, што жыцьцё — гэта нейкая вадкая субстанцыя, якая можа набываць мноства розных нечаканых формаў... Зрэшты, я пражыў у Францыі пяць гадоў і заразіўся ад французаў ідэямі левага толку. Таму бачу ў вашым грамадзтве, як ні дзіўна, пазытыўныя элемэнты.

Што ж да беларускай публікі, дык мяне зьдзіўляе яе здатнасьць цалкам засяродзіць увагу на аб'екце мастацтва. Магчыма, гэта фэномэн этнічны, магчыма, сацыяльны, але такога я ўжо даўнавата не сустракаў.

**«НН»: Вы нарадзіліся ў Таджыкістане, выраслі ў Мурманску, па крыві напалову расеец. Чаму творыце па-ўкраінску?**

**А.С.:** Спрацоўвае нейкі мэханізм. Часьцяком рок-музыкі розных этнаменшасьцяў, мовам якіх пагражае зьнікненьне, пачынаюць сьпяваць на гэтых мовах. Магчыма, гэта форма пратэсту, але хутчэй за ўсё — натуральная форма абароны самой меншасьці.

**«НН»: У адным інтэрвію Вы сказалі: «Мы нарэшце канчаткова зразумелі, што граем этна-рок», а апошні альбом «Файно!» цалкам адпавядае гэтаму азначэньню. Што Вы разумееце пад этна-рокам?**

**А.С.:** Гэта зьліцьцё сучаснае англасаксонскае ды афраамэрыканскае музычнае культуры зь мясцовай шматвекавой народнай традыцыяй.

**«НН»: Альбом атрымаўся шматмоўны як ніколі. Ці будзеце працягваць экспэрымэнты ў гэтым кірунку? На якой яшчэ мове загучаць «ВВ»?**

**А.С.:** Усё гэта дзеля забавы, асноўнай мовай была й будзе ўкраінская.

**«НН»: Хоць і завецца дыск «Файно!», але настрой ён стварае не такі аптымістычны, як папярэднія. Гэта зьвязана зь нейкімі зьменамі ў Вашым сьветаадчуваньні?**

**А.С.:** Не, хутчэй проста вяртаемся да каранёў. Бо менавіта так першапачаткова гучалі «Воплі Відаплясава» на канцэртах.

**«НН»: У Вашай традыцыйнай лірычнай гераіні Галі зьявілася альтэрнатыва — Караліна. Вытанчаная кабета, жарсьць да якой мае інтэлектуальнае, эстэцкае адценьне. Аб чым сьведчыць ейнае зьяўленьне?**

**А.С.:** Гэта гаворыць пра раздваеньне, ці, дакладней кажучы, поліфанію маёй музычнай асобы, як і любой іншай асобы ў прынцыпе. Кожны песенны пэрсанаж ствараецца новай асобай, што мае свой індывідуальны характар і свае прыхільнасьці.

**«НН»: А як трапіў у альбом дзед Бабай, якім палохаюць беларускіх дзяцей?**

**А.С.:** Маё раньняе дзяцінства прайшло ў Таджыкістане. Таджыкі таксама ведаюць, хто такі Бабай, — нават, па-мойму, гэтае слова мае цюркскае паходжаньне.

**«НН»: Калі б Вы пісалі Эвангельле ад Алега Скрыпкі, што ў ім было б спачатку: Слова альбо Музыка?**

**А.С.:** Спачатку былі б цішыня й спакой.

**Гутарыў Зьміцер Галка**

# Аліндаркі року

**Герой Багушэвіча вагаўся: якую песьню выбраць для сваёй дудкі? Сумную ці вясёлую? Сёньняшнія беларускія музыкі рэдка задумваюцца пра альтэрнатыву. Я маю на ўвазе альтэрнатыву моўную. А як было б талкова, каб у кожнага расейскамоўнага музыкі зьявіліся ў праграмах беларускія песьні. І не для адчэпнага, а на гіт-парадавой. Ужо ж дарослыя!**




Большасьць маладых рок-камандаў — расейскамоўныя. Шчыльныя рады беларускамоўных гуртоў папышаюцца ня столькі за кошт новых людзей, колькі новымі назвамі. «NRM» існуе адразу ў колькіх іпастасях («Zet», «Крамбамбуля», «Гарацкія»). Яны запаўняюць нішы, якія ніхто іншы не бярэцца запаўняць. Запаўняюць мэтадычна, разумна, зь бізнэс-плянам у галаве да беларушчынай у сэрцы трывожным. Лявон Вольскі — адзін з найпапулярнейшых сярод маладзі людзей. Гэта Лявонавы песьні, ігнараваныя FM, пры канцы XX ст. засьпявалі пад гітару расейскамоўныя падлеткі па дварох і пад'ездах усяе Беларусі. Гэта на канцэрты «NRM» валам валіць моладзь нават у тых гарадох, дзе пакуль яшчэ «бальшыня» галасуе за «саюз». Значнае дасягненьне ў беларускіх умовах, калі шоў-бізнэс зарыентаваны на расейскае, а наваствораныя тутэйшыя групы ўпарта малпуюць маскоўскія ўзоры.

Табе прапануюць модны праект «Патриот», а ты чуеш лесьбійскія прыдыханьні цёці з «Гостей из будущего» (Расея). Табе гаворыць пра супэрадкрыцьцё — магілёўскую групку «Афазия» (ня знаю, ці так гэтае адкрыцьцё пішацца), а ўвушшу — грубая падробка пад «Арию» (Расея).

А вось радыё. Вядучая незнарок спыталася ў кагось з «русамузаў» пра імавернасьць сьпяваньня па-беларуску і пачула варты адказ: «Хватит того, что есть. Нужно же кому-то петь по-русски. Для разнообразия». Разумнейшыя спасылаюцца на кан'юнктуру музычнага рынку, большую канкурэнтаздольнасьць расейскамоўнага прадукту. Але ж праекты Лявона Вольскага маюць посьпех! Саромеюцца «русамузы» ў адкрытую сказаць, што ўсё адна ім думка мозаг сушыць: «раскруціцца» ў Маскве. Многія спрабуюць, але бальшыня вяртаецца дадому-дахаты: учора ён пад пахай у Крутога — а сёньня яго фамілія Мінскі.

Засмучае тое, што па сьлядах гэтага «адпрацаванага матэрыялу» крочаць новыя арляняты. Гурт «Імпэт», які дэбютаваў у 2001-м з супэргітом «Зусім няпроста», цяпер рыхтуе да запісу практычна цалкам расейскамоўны альбом. Дана Жвалік не паверыла ў свае сілы ды сышла ў расейшчыну.

Ёсьць толькі пара пасьпяховых расейскамоўных праектаў, народжаных тут. Шкада, што ў Расеі яны аніяк не рэпрэзэнтуюць Беларусь. У тэкстах «Ляпіса Трубяцкога» ці «Красак» адсутнічае беларуская прастора, беларуская душа загнаная ў далёкія закуточкі. Зрэшты, спакваля гурты вяртаюцца да свайго. Сяргей Міхалок працуе з Л.Вольскім над песьняй да «Крамбамбулі-2». Аксана Кавалеўская на апошнім канцэрце сьпявала свой варыянт NRM-аўскіх «Трох чарапах». Ізноў навідавоку ўплыў Л.Вольскага!

Гурт «Нэйра-Дзюбель» таксама рыхтуе цалкам беларускую праграму. Гэта радуе. Як і тое, што некаторыя тутэйшыя расейскамоўныя згадваюць, што жывуць усё-такі паміж Менскам і Рымам, а ня між Берасьцем і Ўладзівастокам.

**Сяргей Балахонаў**

# Буш і Бог

**Дзень у Белым доме пачынаецца звычайна з чытаньня Бібліі. Гаспадар заахвочвае сваіх супрацоўнікаў шукаць новых сілаў у Сьвятым Пісьме. Сам Джордж Буш штодня вывучае Біблію і моліцца. Пасяджэньні ўраду таксама пачынаюцца з малітвы.**



Джордж Уолкер Буш — першы сын Джорджа і Барбары Буш. Здымак 1947 году, калі Буш-старэйшы скончыў навучаньне ў Ельскім унівэрсытэце



Джордж Буш-малодшы з бацькамі, 1950-я г.

## Антонімы: Клінтан—Буш

Два гады таму, падчас інаўгурацыі, у Буша спыталі, які рэкорд ён усталюе ў гэты дзень. Традыцыя рэкордаў была закладзеная Клінтанам. Бушаў папярэднік за дзень інаўгурацыі пасьпеў наведаць адзінаццаць розных баляў. (Прыёмы і балі — абавязковы атрыбут інаўгурацыі. У іх бярэ ўдзел пад 50 тыс. чалавек. Трапіць на гэткі баль можна па платным запрашальным квітку.) «Я раней, чым усе ранейшыя прэзыдэнты, лягу ў гэты дзень спаць», — адказаў Буш. І, пільнуючыся раскладу, а палове на дзясятую ён разьвітаўся з гасьцямі.

У гэтым анэкдатычным выпадку — увесь Джордж Буш.

Біл Клінтан запомніўся Амэрыцы як бліскучы, але несур'ёзны сьвецкі леў, якому пашчасьціла кіраваць краінай у эпоху беспрэцэдэнтнага эканамічнага росту і ўпэўненасьці ў будучыні. Але Клінтан і ягоная каманда заслужылі адмоўную маральна-этычную ацэнку, прычым ня толькі сярод хрысьціянскай правіцы і ультракансэрватараў.

Гэта зьвязана як з справай Монікі Левінскі, так і з сумнеўнымі маёмаснымі гешэфтамі Клінтана, яшчэ калі той быў губэрнатарам Арканзасу. Вельмі многіх абурыла і тое, што Белы дом у 1992—2000 г. стаўся карчмой, дзе задарма «на ноч» спыняліся clintonians — улюбёнцы прэзыдэнта, ягоныя партайгеносэ і патэнцыйныя фундатары Дэмакратычнай партыі. Не дадаў сабе Клінтан папулярнасьці й прыхватызацыяй дзяржаўнай мэблі. У 2000 г., выяжджаючы зь Белага дому, ён вывез каля 200 прадметаў.

Буш зусім не такі. Ягоны штаб дысцыплінаваны ня менш за самога прэзыдэнта. Апошні ж, у параўнаньні з сваім самаўпэўненым і самазаканым папярэднікам, здаецца ўзорам сьціпласьці й блізкасьці да народу. Буш дагэтуль застаецца «сваім мужыком». Ён карыстаецца кожнай магчымасьцю, каб уцячы з Вашынгтону ў свой тэхаскі фальварак. Таму нават у анархісцкім Тэхасе, дзе ня дужа любяць сталічных разумнікаў, рэйтынг Буша-малодшага расьце. Праўда, за мяжой вобраз «фанабэрыстага каўбоя» выклікае антыамэрыканскія пачуцьці.

## «Што зрабіў бы Ісус?»

Сапраўды, у Бушавым характары ёсьць крыху фанабэрыі. Ён паходзіць з уплывовай сям'і з Канэктыкуту. Бушы пасылаюць сваіх дзяцей толькі ў «правільныя» прыватныя школы ды ўнівэрсытэты, кшталту Ельскага і Гарвардзкага.

У гэтай сям'і Джордж-малодшы колісь быў «брыдкім качанём». Паліў, меў вялікія праблемы з алькаголем ды мноства іншых заганаў. Жыцьцё Джорджа зьмяніла навяртаньне ў мэтадысты (адна з пратэстанцкіх плыняў, кшталту баптыстаў), якое адбылося ў 1985 г. З Аб'яднанай мэтадысцкай царквой ён зблізіўся дзякуючы жонцы Лаўры. Ахрысьціўшы блізьнятак Барбару і Джыну, Буш афіцыйна перайшоў у мэтадысты. Амэрыканскі прэзыдэнт распавядае пра сваю сустрэчу з харызматычным прапаведнікам Білі Грэгемам (цяпер ён — сябра сям'і Бушаў): «Я неяк правёў выходныя зь вялікім Білі Грэгемам. У выніку нашых гутарак і ягонага ўплыву, я знайшоў у сваім сэрцы Ісуса Хрыста і аддаў яму сваё жыцьцё».

Вынікам навяртаньня стала адмова ад алькаголю і тытуню ды суворая працоўная й жыцьцёвая дысцыпліна. У гэты панятак уваходзяць як бег з гімнастыкай, так і штодзённае вывучэньне Бібліі ды малітва. І, натуральна, — пераканананасьць у сваёй далучанасьці да вялікай місіі. Буш дзейнічае паводле прынцыпу «Што зрабіў бы на маім месцы Ісус?».

## Сьвятары ў дарадцах

Падчас свайго губэрнатарства ў 1994—2000 г. і ў пачатку прэзыдэнцтва Буш імкнуўся ажыцьцявіць праграму «дабрачыннага кансэрватызму». Сьпічрайтэр прэзыдэнта Майкл Герсан характарызуе яе як сацыяльна скіраваную палітыку, што абапіраецца на традыцыйную мараль.

Але не рэалізацыя гэтае праграмы сталася асноўным сэнсам Бушавага прэзыдэнцтва. Галоўная задача акрэсьлілася пасьля тэрактаў 11 верасьня. У першыя дні пасьля атакі побач з Бушам былі ня толькі палітычныя дарадцы, але й прапаведнік Білі Грэгем ды прэсьвітэр «роднае» царквы прэзыдэнта Джым Мэйфайлд.

У часе перадвыбарнага тэледыбою з сваім супернікам Горам Буш назваў любімым палітычным філёзафам Ісуса Хрыста. Эўрапейцаў гэта хіба насьмяшыла б. Але ў рэлігійнай Амэрыцы, дзе, паводле апошніх апытаньняў, 2/3 людзей вераць у існаваньне чартоў, такое прызнаньне ўхваленае бальшынёй і апраўданае з маральнага й інтэлектуальнага пункту гледжаньня.

## З імпэтам місіянэра

Вестка пра тэракт 11 верасьня засьпела Буша ў адной флярыдзкай школцы. Сядаючы ў самалёт, прэзыдэнт абвесьціў: «Мы на вайне». Праз тры дні, падчас жалобнай імшы ў Вашынгтонскай Катэдры, ён дадаў: «Я чалавек любові, але мушу выконваць ускладзеныя на мяне абавязкі, і я буду гэта рабіць».

Як сумясьціць хрысьціянскі запавет любові й абавязкі кіраўніка звышдзяржавы? Прэзыдэнт патлумачыў гэта свайму сябру Мэрвіну Оласкаму, ідэолягу кансэрватыўных хрысьціянаў. Запавет Хрыста «падстаўць другую шчаку» тычыцца асабіста Буша-хрысьціяніна. Буш-прэзыдэнт кіруецца іншым выслоўем Бібліі: «Хто пралíе кроў чалавечую, таго кроў пралíецца рукою чалавека: бо чалавек створаны паводле вобразу Божага». (Быцьцё 9:6).

«Вось зла», акрэсьленая Бушам на сусьветнай мапе, па сутнасьці сваёй ёсьць тэалягічнай ідэалягемай. Прэзыдэнцкія сьпічрайтэры выкарысталі спачатку фармулёўку «вось нянавісьці». Але пасьля сам Буш замяніў яе на «вось зла». Гэтае акрэсьленьне перагукалася з Рэйганавым азначэньнем СССР як «імпэрыі зла». Падзел сьвету на дзяржавы, што ў барацьбе з тэрорам могуць быць адно «за нас» ці «супраць нас», — вынік рэлігійнага пераканаьня, што богабаязны чалавек павінен адрозьніваць Добрае і Дрэннае. А яшчэ ў імкненьні выйграць на чале дэмакратычных сілаў барацьбу супраць таталітарызму і тэрору хаваецца ладная порцыя місіянэрскага імпэту.

## Спакойна, як дзяржаўнік

Але свой імпэт амэрыканскі кіраўнік трымае пад кантролем здаровага дзяржаўніцкага сэнсу. Абяцаньнямі «выкурыць забойцаў» і знайсьці бэн Ладэна «жывога ці мёртвага» Буш цешыў сваіх тэхаскіх землякоў. Разам з тым ён не сьпяшаўся распачынаць вайну супраць аль-Каіды і талібаў.

Гэтаксама і ў спрэчцы паміж «каршунамі» зь Мінабароны і «галубамі» зь ДзяржДэпартамэнту. Калі паўстала дылема — ці выносіць ірацкае пытаньне на разгляд ААН, ці адразу выпраўляць войскі ў Багдад, Буш схіліўся на карысьць першага. Бо разумее, што мусіць браць у разьлік замежную й абаронную палітыку.

Буш усьведамляе, што ён — не інтэлектуал, і пакладаецца на свой палітычны інстынкт ды розум. Ён ведае, што як дома, так і за мяжой яго моцна недаацэньваюць. Гэта раней дапамагала яму браць усё новыя кар'ерныя вышыні. «Людзі мяне заўжды недаацэньвалі. Сабе на шкоду», — іранізуе Буш.

**Паводле «Frankfurter Allgemeine Zeitung» пераклаў Сяргей Богдан**



З УСІХ СТАРОН

## Францішка Сокалава ледзь ня стала жонкай прэзыдэнта

**Апошнім канкурэнтам Вацлава Клаўса ў змаганьні за чэскі прэзыдэнцкі фатэль быў Ян Сокал, дэкан факультэту гуманітарных навукаў Карлавага ўнівэрсытэту.** Ягоная жонка пані Францішка Сокалава — вядомая беларусістка, дачка найбуйнейшага чэскага філёзафа Яна Патачкі, духоўнага лідэра «Хартыі-77». Яна дасьледавала беларускія старадрукі, брала ўдзел у Праскай нарадзе па ўнармаваньні беларускага правапісу (1999). А па-беларуску яна размаўляе лепей за сярэдняга менчука.

## Чарнавіл на грашах

**Нацбанк Украіны выпусьціў памятную манэту «Вячаслаў Чарнавіл» наміналам 2 грыўні, прысьвечаную стваральніку Народнага Руху.** Манэта зробленая з нэйзыльбэру і важыць 12,8 г. Дэпутат Чарнавіл загінуў у аўтакатастрофе 25 сакавіка 1999 г. Ягоны аўтамабіль сутыкнуўся з КамАЗам, што развярочваўся на шашы. Апазыцыя вінаваціла ў здарэньні ўлады. Ягоную справу ў палітыцы працягвае сын Тарас.

**Н.С., Прага; Сяргей Б., Кіеў**

Вольга Цяцёркіна

# Полацкія прывіды — 2



ЛІЯ КІЙКО

## Цмачыха Валовай азярыны

У вадаёмах Беларусі ад старажытных часоў вяліся розныя пачвары. Самым знакамітым прадстаўніком гэтае фаўны быў цмок зь Лепельскага возера. Вядомы ён быў найперш цераз свой апэтыт. Страшыдла час ад часу ўздымалася з азёрных глыбіняў, перакусвала чаўны і з смакам жэрла грамадзянаў Вялікага Княства Літоўскага. Такая неляяльнасьць да краіны, што дала ёй прытулак, доўга цягнуцца не магла.

З Полацку, які здавён быў гняздом альхімікаў і чарнадзеяў, у Лепель таемна прыехаў маг Вінцэнт з асыстэнтамі. Тры дні яны гатавалі барылку — жудасную атруту, якая магла выправіць на той сьвет жыхарства ўсяго Полацкага ваяводзтва. У ціхую раніцу Вінцэнт абняўся з вучнямі і, павесіўшы на грудзі сьмертаносную барылку, сеў у човен... Больш альхіміка ніхто не бачыў. Затое цмок праз два дні ўсплыў дагары чэравам. І смурод ад яго быў чуваць аж у Полацку за семдзесят вёрстаў. Здох, адным словам.

Але справа ягоная — жыла. Бо ў Валовай азярыне, што паблізу Полацку, задамавілася кузіна (паводле іншых зьвестак — пазашлюбная дачка) пачвары. Паўнакроўная да жыцьцярадасная, без праблемаў спраўлялася яна з прыгожымі нявіньніцамі, якімі здавён улагоджвалі яе мясцовыя паганцы.

Калі Полацак прыняў хрост і ахвяры зрабіліся нерэгулярнымі, галодная цмачыха пачала кідацца на кожны падазроны (ва ўежнасьці) прадмет. Спачатку яна паспытала крыжоў, усталяваных хрысьціянскімі місіянэрамі на колішнім паганкім капішчы. Сымбалі новай веры былі вырваныя й раскіданыя. На іх пазаставаліся адбіткі магутных зубоў. Аднак нясмачнымі, відаць, падаліся крыжы, бо хутка цмачыха пераарыентавалася на тых, хто іх усталёўваў. Пазьней у ненаеднай пашчы зьнікалі заезджыя крыжакі, у сярэдзіне XVII стагодзьдзя ля Валовай азярыны прапала больш за сорак маскоўскіх стральцоў. Відаць, палачане, якія таемна трымаліся паганства і ня вельмі любілі акупантаў, такім чынам падкормлівалі жывы сымбаль сваёй дзяржаўнай і рэлігійнай незалежнасьці. У 1812 годзе цмачыха зноў нагадала пра сябе. Пагодным днём францускія афіцэры з гарнізону маршала Сэн-Сыра захацелі выпіць на беразе Валовае азярыны ў вольную ад акупацыйнага клопату хвіліну. Ня ведалі, якой нядобрай славай карыстаецца гэты зацішны куток. Болей іх ніхто ня бачыў.

Кажуць, французы, помсьцячы, перад сыходам з Полацку расстралялі цмачыху з гарматаў. Паводле іншай вэрсіі, яна ўратавалася — падземнымі воднымі шляхамі выйшла ў Дзьвіну й атабарылася ў ейных вірах ды затоках. Для гэтай вэрсіі ёсьць важкія падставы: у Дзьвіне хтось пачаў нападаць на купальшчыц. Так, у 1820 годзе ў Краслаўцы нейкае страшыдла адкусіла руку дзяўчыне, якая мірна сабе плавала. Няшчасьніцу тую ледзь вынялі з вады. У 1884-м хтосьці спрабаваў зацягнуць на дно іншую купальшчыцу акурат у тым месцы, дзе Дрыса зьліваецца зь Дзьвіной, але дзяўчына здолела ўратавацца. Усё гэта прэса сьпісвала на гіганцкіх, у 3—4 пуды, самоў. Але, на думку Ўладзімера Арлова, спэцыяліста па полацкіх прывідах і зданях, рабіла гэта цмачыха з Валовай азярыны.

Слынны прывідазнаўца ў час адной зь нядаўніх экспэдыцый у Полацак на ўласныя вочы бачыў прывідную цмачыху, што ўсплыла была, калі ён зь юнай чытачкай шпацыраваў каля Валовай азярыны. Трэба аддаць належнае пісьменьніку, які не штурхнуў спадарожніцу ва ўсьпененыя хвалі. Ён з годнасьцю й належнай хуткасьцю адступіў на бясьпечную дыстанцыю — да стаянкі таксовак.

Прывідазнаўца мяркуе, што тут мы маем справу з эфэктам падваеньня, калі рэальны праўобраз прывіду не спыняе свайго біялягічнага існаваньня, а толькі бывае змушаны ў сілу нейкіх драматычных абставінаў пакінуць родныя мясьціны, захаваўшы сваю прысутнасьць там у іпастасі бясшкоднага двайніка.

Сёньня бераг Валовае азярыны — змрочная мясьцінка. Ня так даўно там бясьследна зьнік экскаватар. За ноч гаротную машыну быццам карова языком зьлізала. Мо гэта цмачыха нагадвае нам пра сваё існаваньне?

Пагатоў, жыхары навакольных вуліцаў сьцьвярджаюць, быццам цёмнымі начамі ў глыбіні Валовай азярыны штосьці пачынае сьвяціцца, потым гэтае штосьці набывае абрысы велізарнага трытона й імкліва ўсплывае, змушаючы міжвольнага гледача падмазваць пяты.

## Цар і манах

Здань Пятра I час ад часу зьяўляецца на Верхнім замку ў Полацку і спрабуе справіць малую патрэбу на белую сьцяну Сафіі. У самы пікавы момант з мораку выбягае манах-базыльянін і дае расейскаму імпэратару магутнага высьпятка. Можна меркаваць, што другая здань — айцец Язэп Анкудовіч, адзін з шасьці ўніяцкіх сьвятароў, на якіх Пётар I зь Меншыкавым і прыдворнымі напаў у храме. Гэтак скончылася экскурсія, зладжаная айцамі для цара. Разьюшыў Пятра абраз сьвятога ўніята Язапата Кунцэвіча. «Хто гэта такі?» — зароў цар. Айцец Канстанцін мужна адказаў, што гэта пакутнік Язапат, забіты віцебскімі схізматыкамі. Праваслаўныя Пётар I і Меншыкаў выхапілі шаблі ды пачалі секчы сьвятара. Па Сафіі паплыў крывавы ручай... Айцец Язэп уратаваўся: злачынцы палічылі яго мёртвым. Астатніх пяцёх сьвятароў закатавалі да сьмерці. Гэта здарылася на наступны дзень пасьля імяніннаў Пятра, чым можна вытлумачыць цяжкі ранішні настрой цара і ягонага атачэньня.

Пасьля забойства манахаў цар загадаў сабор зачыніць і ператварыць яго ў вайсковае сховішча. Пад Сафіяй нават адзін час трымалі коні, а ў сутарэньнях было парахавое сховішча, якое выбухнула якраз у дзень адыходу расейскіх войскаў з Полацку ў 1710 годзе. Прычым у той Паўночнай вайне расейцы былі хаўрусьнікамі — мы разам зь імі ваявалі супраць Швэцыі. Чаму Пётар зьяўляецца ў Полацку? Відаць, як любога злачынцу, яго цягне на месца злачынства.

## Сімяон

Мала хто ведае, з прычыны пазьнейшае ідэалізацыі, што Сімяон Полацкі быў ня толькі высокаадукаваным сынам свайго часу, але й не абы-якім лявэласам. Так, паводле афіцыйнай вэрсіі, Сімяон, які скончыў Віленскі ўнівэрсытэт у 50-я гады XVII стагодзьдзя і жыў у Вільні, пакінуў Крывіцкую Мэкку пасьля штурму й захопу гораду царскімі вайскамі. Але зь іншых крыніцаў вядома, што сапраўднай прычынаю стаўся бурны раман зь непаўналетняй дачкой віленскага бурмістра. Каханкаў застукалі на гарачым проста каля Вяльлі, недалёка ад Замкавай гары.

Сімяон палічыў за лепшае вярнуцца ў родны Полацак, хоць той і быў пад расейскай акупацыяй. Цягнула яго родная зямля: старажытная Сафія, Спаса-Эўфрасіньнеўская царква... Але найбольш вабілі прыдзьвінскія прыгажуні.

Скаргі на Сімяона ад маладых дзяўчат і замужніх кабетаў пасыпаліся адразу. Хвіліннную слабасьць жанчынаў можна зразумець: Сімяон быў імпазантным таленавітым маладым манахам, які чытаў вершы й валодаў мовамі.

Урэшце полацкі япіскап Каліст ня вытрымаў і прызначыў Сімяону ганебнае пакараньне ў выглядзе працы ў хляве, а пасьля ўвогуле пасадзіў у вязьніцу. Знайшліся багатыя заступнікі, якія вызвалілі Сімяона. Але Каліст працягваў яго перасьледаваць, і ў хуткім часе Сімяон зьехаў у Маскву.

Там ён супакоіўся, заняўся справай. Адчыніў незалежную ад патрыяршай цэнзуры друкарню, павялічыўшы гэтым самым колькасьць друкарняў у Маскоўскай дзяржаве ўдвая — была адна, а стала дзьве. Тады як у нашай краіне было іх 134.

Уладзімер Арлоў меў неасьцярожнасьць згадаць пра гэты факт у фільме «Сімяон Полацкі», створаным на кінастудыі «Летапіс». І стужка была імгненна зьнятая з тэлепраграмы, ператварыўшыся ў такі сабе фільм-прывід, які можна было бачыць надзвычай рэдка ў зачыненым цяпер менскім кінатэатры «Зьмена».

…Недалёка ад Богаяўленскага манастыра ёсьць пляцык з балюстрадай і густымі зацішнымі зарасьнікамі, адкуль адкрываецца прыгожы краявід Дзьвіны. Менавіта там зьяўляюцца дзьве здані — Сімяон у чорным манаскім адзеньні ды юная стройная дзяўчына ў сьветлым.

Славамір Адамовіч



***

Адзінота. Адліга... Напуста
пражываю гады і дні
і чарнею душой, нібы луста,
наша луста ў чужым агні.
Безь мяне вырастаюць дочкі,
не са мной мае жонкі сьпяць,
побач толькі нянавісьць крочыць,
за сьпіною выжлы хрыпяць.
Хто ж там прагне вершыкаў Славы?
Хто ў этэры мой ловіць крык?
Я пісаў языкамі лавы,
а ў адказ мне — зьмяіны сык...
Што ж, лясы вызваленчай справы
зноў нашчадкам з нуля ўздымаць.
Рыштаваньнямі, як аправай,
хай спрабуюць наш Край абняць.
Там, у Будучыні, магчыма,
белым днём народзіцца ён,
беларускі герой-мужчына
зь пераможным словам «Рубон!».

***

Памятаеш, каханая,
быў сад, і конь малады
мокрымі тыцкаўся храпамі
ў крыжык твой залаты.

Яблыкі падалі. Весела
елі мы сьпелы ранет,
пасьля ты моўчкі павесіла
на гронку шыпшыны барэт.

Памятаеш, каханая,
ты мне шаптала ў далонь,
калі па зямлі неўзаранай
працокаў сонечны конь.

***

Няўжо і пра цябе, о Сандвіка*,
я напішу, як некалі пра Вільню:
зь любоўю і жальбой, прыгожа, стыльна,
і, што галоўнае, — кірылічнаю графікай?

О Сандвіка! Твой край такі ж прыгожы,
як Бацькаўшчына белая мая.
Магчыма, сёньня ты мне дапаможаш,
а заўтра я сплачу табе спаўна.

Як доўга я чакаў, што на Радзіме
нарэшце пойдзе спорны сьвежы дождж,
а ён ішоў над Сандвікай гадзіну,
а потым бліснуў жоўты сонца грош.

І паплылі над ф'ёрдамі аблокі,
працятыя праменьнямі сьвятла,
і скальны мох тысячагодзьдзяў токі
аслабаніў з каменнага жытла.

* Sandvika — мястэчка на ўсходзе Нарвэгіі.

ФЭЛЬЕТОН

# Як я галасаваў

У першую раніцу датэрміновых выбараў нашая камэндантка лётала па інтэрнаце як падпаленая — ледзь ня зьбіла з ног. «Ты галасаваў? Не?! Пашпарт у рукі і бяжы!» — «Няма пашпарта». — «Студэнцкі бяры!».

То добра, думаю, — хвалююцца за мяне. Але моцнага жаданьня бегчы так рана ўсё адно не зьявілася. Дый афіцыйнага пацьверджаньня адмовы ад галасаваньня не патрабуецца. Аднак у гэты дзень болей і не чапалі.

А назаўтра завітаў стараста паверху, каб перапісаць, хто ў які дзень пойдзе волевыяўляцца. Запытвае, ці ведаем мы кандыдатаў. Во дае! Мы ж зь імі ледзь не штовечар піва п’ём, размаўляем па-нармальнаму. Во дае… Дзіўны такі: падказвае нам, на ўсялякі выпадак, хто зь іх лепшы. То добра, думаю, бо я ў гэтых квадрацікax-птушачках яшчэ з прэзыдэнцкіх блытаюся.

І вось надышла доўгачаканая нядзеля. Я — малады, бязьмежна задаволены сабой, усім сваім выглядам дэманструючы неад’емнае права на выбар, бадзёра крочу на ўчастак. А колькі дадатковае радасьці па дарозе дораць гэтыя шчасьлівыя твары, што плывуць насустрач! У руках людзі нясуць сьвежыя кандытарскія цуды! Вядомая справа: такія халяўныя цэны бываюць толькі раз на два гады…

Вось ён, мой шчасьлівы білет у сьветлую будучыню, мой бюлетэньчык. Толькі б цяпер не памыліцца… Але што гэта? Я тут, разумееце, думаю сабе, а рука ўжо старанна выводзіць у трох словах сваю (маю?) грамадзянскую пазыцыю…

Ну, урэшце, і тое добра таксама.

Як там гэта называецца… мускульная памяць?

**Студэнт**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Бабкоў І. Філязофія Яна Сьнядэцкага**. — Менск—Вільня: І.Логвінаў, 2002. — 126 с.

Дадаткам да часопісу «Фрагмэнты» выйшла кніга філёзафа Ігара Бабкова. Дасьледаваньне закранае гісторыю беларускай філязофіі эпохі Асьветніцтва. Асноўная ўвага сканцэнтраваная на постаці Яна Сьнядэцкага. Яго творчы росквіт прыпаў на час працы ў Віленскім унівэрсытэце, дзе навуковец быў рэктарам, а пасьля — астраномам. Наклад 250 ас.




**Беларусь—Японія = Беларусь—Япония = Belarus—Japan:** Матэрыялы Другіх міжнар. чытаньняў, прысьвечаных памяці Іосіфа Гашкевіча. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003. — 400 с.: іл.

Зборнік зьмяшчае артыкулы, датычныя біяграфіі й навуковай спадчыны знакамітага ўраджэнца Беларусі, беларуска-расейска-японскіх кантактаў. Значнае месца ў кнізе займае таксама інфармацыя пра гісторыю й культуру Астравеччыны, дзе нарадзіўся ды памёр І.Гашкевіч. Наклад 600 ас.

**Мэдыі ў посткамуністычных краінах: аб’ектыўная інфармацыя супраць ідэалягічных скажэньняў = Media in Post-Communist Societies: Objective Information vs. Ideological Bias** / Нарвэскі Хельсынскі Камітэт; Нарвэскі ПЭН-клюб; Беларуская асацыяцыя журналістаў; Беларускі ПЭН-цэнтар; Пад рэд. А.Анціпенкі: Матэрыялы міжнар. канфэрэнцыі, Менск, 18—19 кастр. 2002 г. — Санкт-Пецярбург: Азбука, 2003. — 176 с.

**Хваліна Т. Пінск: Чароўная казка Палесься.** — Менск: Вышэйшая школа, 2002. — 112 с.: іл.

На беларускай, расейскай і ангельскай мовах кніга распавядае пра гісторыю, архітэктурна-гістарычныя помнікі й жыцьцё «сталіцы Палесься» — Пінску. Паводле Ўладзімера Караткевіча, гэта «горад зь вялікай літары», горад, які «мае сваю фізіяномію». Угледзецца ў «твар» места дазваляюць шматлікія фатаздымкі. Альбом мае вялікі фармат, высокую паліграфічную якасьць — словам, ідэальны падарунак. Цана ў «Акадэмкнізе» 7660 руб., наклад — 3000 ас.

**Słonim — Odsłony = Аблічча Слоніма = Slonim in Acts**. — Warszawa, 2002. — 108 с: іл.

Задума гэтага альбому — паказаць аблічча старажытнага гораду ў розныя пэрыяды ягонай гісторыі. Выданьне зьмяшчае фатаздымкі, зробленыя ў 1940-я, і кадры, адзьнятыя на мяжы XXI ст. Аўтар першай групы здымкаў — Юзаф Шыманчык, вядомы найперш як выдатны фатограф Палесься. Дагэтуль ягоная слонімская калекцыя нідзе не публікавалася. Сучасныя ж здымкі рабілі студэнты Варшаўскага ўнівэрсытэту. Мастацкія вобразы дапаўняюцца грунтоўнаю прадмоваю, што распавядае пра гісторыю гораду й ягоныя цікавосткі.




**10 Jahre Deutsch-Belarussische Beziehungen: Eine Bilanz = 10 лет германо-белорусских отношений: Итоги развития.** — Берлин—Минск, 2003. — 126 с.: іл.

У выданьні ўтрымліваецца інфармацыя пра палітычнае, эканамічнае, культурнае ўзаемадзеяньне дзьвюх дзяржаваў. Асаблівая ўвага надаецца дзейнасьці ў Беларусі разнастайных нямецкіх фондаў і разгортваньню грамадзянскіх ініцыятываў. У дадатку зьмешчаныя зьвесткі пра беларускія ды нямецкія гарады-партнэры, буйныя сумесныя прадпрыемствы, міжшкольныя ды міжунівэрсытэцкі абмен.

**Тацяна Вабішчэвіч**

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### «Нагуаль»+«Яр»

**Такой музыкі, якая будзе гучаць 11 сакавіка, сьцены Палацу рэспублікі яшчэ ня чулі.** У яго малой залі выступіць гурт «Нагуаль», які выконвае «нішцяк-фольк на фанатропнай мове». «Нагуаль» (на здымку — лідэр гурту Леанід Паўлянок) усе свае канцэрты будуе на музычных імправізацыях, выкарыстоўваючы незвычайныя інструмэнты. Таксама ў гэтым канцэрце возьме ўдзел вакальны джазфолькавы дуэт «Яр». Гэтых дзяўчат можна было пабачыць зусім нядаўна на канцэрце «Крыві».


УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

Пачатак у 19.00. Кошт квітка 4—5 тыс.

### Бэнэфіс Трухановіча

**9 сакавіка ў КЗ «Менск» сваю сольную праграму «Нараджэньне таямніцы» будзе прэзэнтаваць Сяржук Трухановіч.** Гэта ўжо другі альбом аднаго з найлепшых гітарыстаў Беларусі. Але ня толькі яго можна будзе паслухаць у «Казе». На тым канцэрце зайграюць таксама Ўладзімер Угольнік і Леанід Вярэніч — выйдзе амаль «Грыфаманія-2003». У другім аддзяленьні выступіць «Крама», што праўда, не арыгінальным складам, бо клявішнік Андрэй Лявончык і басіст Юрась Фядзюк паехалі зарабіць грошай у Бахрэйн. Замест іх падыграюць Уладзімер Гаўрыленка і Кірыла Сенін. У прэзэнтацыі «Нараджэньня таямніцы» таксама возьме ўдзел гурт «Яблычная гарбата».

Трухановіч лічыць, што ягоная музыка не для 15-гадовых, а для людзей больш сталых, улюбёных у гітару па-сапраўднаму. Пачатак у 19.00. Кошт квітка 4—10 тыс.

### Хрэстаматыйныя «Ліцьвіны»

**12 сакавіка ў Доме вэтэранаў (вул. Я.Купалы, 21) адбудзецца канцэрт гурту «Ліцьвіны», прымеркаваны да дзесяцігодзьдзя выхаду іх самага пасьпяховага альбому «Голуб на чарэшні — галубка на вішні».** Альбом гэты нават увайшоў у школьную праграму па беларускай літаратуры («для праслухоўваньня ўклясе») разам зь «Песьнярамі» і «Тройцай».

Непасрэдна на канцэрце можна будзе набыць выдадзены спэцыяльна да гэтай падзеі дыск «Голуб на чарэшні — галубка на вішні» (раней альбом выдаваўся толькі на касэтах), а таксама другі альбом гурту «Ой, у лузе, у лузе».

Пачынаецца канцэрт а 19-й. Квіток каштуе 3,5 тыс.

### «NRM» усё ж прыедзе

**Пры канцы лютага мазыране так і не пабачылі Вольскага, Паўлава, Ляўкова, Дземідовіча,** а таксама загадчыцы Ёцавіцкага ДК — праз арганізацыйныя непаладкі. З музыкамі можна будзе сустрэцца ў мясцовым Палацы культуры **13 сакавіка** а 19-й, заплаціўшы ўсяго 4 тысячы.

«НН» дзякуе за падтрымку спн.Моніцы Банькоўскай-Цюліг (Цюрых).

## У ВІЛЬНІ

### Выстава Карт’е-Брэсона

**Гэтым месяцам у Вільні экспануецца выстава аднаго з самых выбітных фатографаў сьвету — Анры Карт’е-Брэсона.** Першая ў гісторыі Люўру фотавыстава была менавіта ягоная. Цяпер Карт’е-Брэсон, на жаль, адышоў ад фатаграфіі і займаецца выключна маляваньнем.

У Вільні ж найлепшыя залі Цэнтру сучаснага мастацтва зьмясьцілі самую буйную рэтраспэктыўную калекцыю фатаздымкаў француза.

Дагэтуль выстава пабывала ўжо ў шмат якіх краінах, а ў Вільню пераехала з Рыгі. Гэтае турнэ абміне Беларусь, таму беларусам варта пад’ехаць да мэтра самім.

**Дзяніс Раманюк, Вільня**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ДРЭЎЦЫ**

**Прадам вельмі танна** дрэўцы ружы кітайскай, лімонаў, апэльсынаў, грэйпфрутаў, мандарынаў, фіялкі, кактусы, фінік. Т.: 221-21-81

**КАНТАКТЫ**

**Анатоль Івашчанка** і A.Thomas! Паведамце, калі ласка, свае каардынаты ў Беларускі ПЭН-цэнтар

**Віктару Д.** зь Менску. Дашліце копію ліста, пра які была гутарка ў «Паштовай скрыні» «НН», на а/с 342, 220050, Менск. Мабыць, Вы зьвярталіся да нас. Чакаем. Нашчадкі

**Малады** гурт-пачатковец шукае скрыпача альбо скрыпачку. belman@tut.by. Т.: (8-0297) 51-75-43 (Дзяніс)

**«Стары Ольса»** і БМА перанесьлі сярэднявечную дыскатэку ў клюбе «Тунэль» на сярэдзіну красавіка

**«Стары Ольса»** будзе ўдзельнічаць у абодвух канцэртах фэстывалю «Белы Замак»

**Хто, як ня мы?** Гарадзенскі Малады Фронт — кожны чацьвер, 19.30, на вул.К.Маркса, 11

**Усім,** хто мяне любіць, — прывітаньне! Я таксама. Сэрж

**Калі хочаш** быць — будзь хрысьціянінам

**Байкатую** ўсё французскае, нямецкае, бэльгійскае, расейскае — у адказ на іхныя паводзіны ў Радзе Бясьпекі ААН. Беларус

**Браткі зь «Любэ»** ды іншых «Лесапавалаў» мусяць падлогу мыць перад выступам дзяўчат з «Госьціцы». Віктар

**Мянчук** (41/170/53) з в/а, бяз шк/зв, пазнаёмлюся зь дзяўчынай (жанчынай), ня схільнай да паўнаты, бяз шк/зв, для стварэньня беларускамоўнай сям’і. А/с 6, 220012, Менск

**ПРАЦА**

**Шукаю** сталую працу юрыстам. Т.: 274-73-75. Валянціна

**Паслугі** ў доступе ў Internet для гомельцаў. E-mail: bandrej@tut.by. Т.: (8-0296) 53-43-06 (Віталь)

**Шукаю працу**, дзяўчына, 25 год, в/а, адказная, валодаю беларускай і ангельскай мовамі. Т.: (8-0296) 31-09-78

**Шукаю працу** кур’ера. Можна па дастаўцы кампакт-дыскаў. Абы заробак складаў прыстойную суму. Т.: 221-21-81 (праз Інтэрнэт не кантактую)

**Сачыненьні** для старшаклясьнікаў. Хутка. Арыгінальна. Нядорага. Людміла. Т.: (8-0296) 26-04-37

**Вырашэньне** кампутарных праблемаў, мадэрнізацыя, кансультацыі. Т.: 264-68-90

пэйджэр: (017) 2850000, аб. 22773
КНІГІ - ПОШТАЙ
а таксама CD & Video

Адамовіч
Адамчык
Арлоў
Бартосік
Быкаў
Глёбус
Дубавец
Драздовіч
Раманюк
Сагановіч
Станкевіч
Клясыка і найноўшая літаратура, фотаальбомы, публіцыстыка, гісторыя ды іншыя
Праз пошту: п/с 333, 220050 Менск
e-mail: exlibris@tut.by
Internet: http://knihi4u.cjb.net

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ____________________

Імя і прозьвішча ____________________

Адрас, тэлефон ____________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Сяргей Ёрш |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, (0296) 13-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3889.

Нумар падпісаны ў друк 5.03.2003.

Замова № 1246.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а